Сістэма адукацыі Беларусі: да развіцця — праз параўнанне

СТАР 2

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Сакрэты смачных беларускіх страў ад Алены Спірыдовіч

СТАР 3

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

29 ЛІСТАПАДА 2013 г. ПЯТНІЦА № 225 (27590) Кошт 1800 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

■ Заканатворчасць

ЗМЕНЫ Ў ПРАЦОЎНЫ КОДЭКС: КАМПЕНСАЦЫІ, СПОРТ І ДЗЕЦІ

Фота Надзеі БУЖАН.

Законапраект «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь» можа быць разгледжаны Палатай прадстаўнікоў у другім чытанні падчас восеньскай сесіі. Пра асноўныя новаўвядзенні, якія прапануюцца гэтым дакументам, «Звяздзе» паведаміла намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Ларыса БАГДАНОВІЧ.

Сацыяльная скіраванасць

— Працоўны кодэкс быў прыняты больш за 10 гадоў таму, і больш за 5 гадоў у яго не ўносіліся змены, што сведчыць пра высокую якасць падрыхтоўкі закона.

Праектам уносяцца змены ў больш за 170 артыкулаў, аднак гэта не змяняе канцэпцыі і структуры Працоўнага кодэкса, а закон захоўвае сваю сацыяльную скіраванасць. Карэкціроўка адбываецца па наступных кірунках: рэалізацыя рашэнняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і прывядзенне нормаў Працоўнага кодэкса ў адпаведнасць з прынятымі ўказамі кіраўніка дзяржавы, Падатковым кодэксам, Кодэксам аб адукацыі; рэгуляванне працоўных адносін у прафесійным спорце; павышэнне гнуткасці працоўнага заканадаўства дзеля развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы; удасканаленне нормаў Працоўнага кодэкса з улікам практыкі іх ужывання.

У адпаведнасці з рашэннем Канстытуцыйнага Суда ад 17 ліпеня 2009 г. «Пра забеспячэнне роўных правоў грамадзян у сферы працы» і з улікам канвенцый Міжнароднай арганізацыі працы, 14-ы артыкул мае дапаўненні супраць дыскрымінацыі па ўзросце, месцы жыхарства і сацыяльным паходжанні.

Зараз для маці — індывідуальных прадпрымальнікаў заканадаўства не прадугледжвае перадачу права на адпачынак па доглядзе дзіцяці бацьку ці іншаму сваяку, які працуе. Законапраект дае права на адпачынак па доглядзе дзіцяці бацьку ці іншаму сваяку, які працуе, не толькі замест маці — індывідуальнага прадпрымальніка, але і ў выпадку, калі яна з'яўляецца прыватным натарыусам, адвакатам, творчым работнікам, рамеснікам, працуе ў сферы аграгурызму.

СТАР.2



НА ЎСЯЛЯКІ ПАЖАРНЫ...

На станцыі Баранавічы-Паўночныя адбылося тактыка-спецыяльнае вучэнне па дэманстрацыі гатоўнасці сіл і сродкаў Баранавіцкага гарадскога звяна Брэсцкай тэрытарыяльнай падсістэмы ГСНС пры пагрозе і ўзнікненні надзвычайнай сітуацыі. Па легендзе вучэнняў, на чыгуначным пераездзе адбылося сутыкненне таварнага саставу з аўтамабілем. У аўтамабілі, які дэфармаваўся і загарэўся, заблакаваны пацярпелыя, у выніку аварыі разлілося хімічна небяспечнае рэчыва, з чыгуначнай цыстэрны разлілося і загарэлася дызельнае паліва...

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ, міністр інфармацыі:

«Існуючая сетка праваднога радыё ў краіне будзе захавана. Развіваць правадное радыё і цягнуць новыя лініі ў XXI стагоддзі ніхто ўжо не збіраецца. Але тыя правады, якія ёсць, у агляднай будучыні для радыё будуць захаваны. Правадное радыё — гэта не толькі інфармацыя, культура, музыка, асвета, гэта яшчэ і канал апавяшчэння пры надзвычайных сітуацыях. У Расіі, Кітаі, ва Украіне захоўваюць сетку праваднога радыё. Падчас разбуральнай паводкі ў горадзе Крымску своечасова даведаліся аб тым, што здарылася, толькі тыя людзі, у чыіх кватэрах былі радыёкропкі. Дарэчы, дзякуючы супрацоўніцтву з Мінсувязі ў раёнах ужо ёсць магчымасць павялічваць мясцовы складнік правадного радыё да 3 гадзін у тыдзень».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.11.2013 г.

Долар ЗША	9330,00	▲
Еўра	12680,00	▲
Рас. руб.	282,00	▼
Укр. грыўня	1136,83	▲

■ Супрацоўніцтва

НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ БАРАЦЬБЫ З НАРКАТРАФІКАМ

Краіны — удзельніцы АДКБ — на парозе новага этапу развіцця супрацоўніцтва ў барацьбе супраць незаконнага абароту наркотыкаў. Пра гэта заявіў дырэктар ФСКН Расіі Віктар Іваноў на пасяджэнні Каардынацыйнага савета кіраўнікоў кампетэнтных органаў па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў дзяржаў — членаў АДКБ. Пасяджэнне прайшло 28 лістапада ў Мінску.

Праводзімая антынаркатычная кампанія дазволіла стварыць у грамадскай свядомасці Беларусі атмасферу нецярпімасці да любых праяў наркатызацыі, лічыць намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Тозік.

«Адной з самых надзённых сацыяльных задач, якія стаяць перад Беларуссю, з'яўляецца стварэнне здаровага грамадства і барацьба з такой негатыўнай з'явай, як распаўсюджванне наркотыкаў. У нашай краіне функцыянуе сістэма прафілактыкі наркатызацыі насельніцтва ў рамках дзяржаўнай праграмы комплексных мер процідзеяння наркаманіі і незаконнаму абароту наркотыкаў. Пытанні прафілактыкі і процідзеяння наркаманіі з'яўляюцца прадметам рэгулярнага разгляду міжведамаснага савета па папярэджанні і прафілактыцы п'янства, алкагалізму, наркаманіі і спажывання тытуню пры Савеце Міністраў», — сказаў Анатоль Тозік.

На думку Віктара Іванова, галоўнай пагрозай для краін СНД і ўсёй сусветнай супольнасці па-ранейшаму застаецца афганская наркавытворчасць і ствараемы ёй трафік, які праходзіць па тэрыторыі краін АДКБ. Таму дырэктар ФСКН Расіі прапанаваў аднавіць высілкі на ўзроўні Савета Бяспекі ААН з тым, каб афганская наркавытворчасць была кваліфікавана як пагроза міжнароднаму міру і бяспецы. Акрамя таго, пытанні афганскай наркавытворчасці і барацьбы з ім праз фарсіраванае альтэрнатыўнае развіццё Афганістана будуць у цэнтры ўвагі саміту «вялікай васьмёркі», які пройдзе ў 2014 годзе ў Сочы пад старшынствам Расіі.

Юрый ЦАРЫК.

■ Нерухомасць: тэндэнцыі

ЗАГАРАДНЫЯ ДАМЫ І ДАЧЫ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ТАННЕЦЬ

Нагадаем, што сёлета ў пачатку сезона на рынку загараднай нерухомасці адбылося традыцыйнае вясновае ажыўленне. Тады колькасць прапаноў садовых домікаў павялічылася прыкладна ў 2 разы. У канцы мая—пачатку чэрвеня прадаўцы яшчэ больш ажывіліся і пачалі актыўна выстаўляць на продаж свае танныя аб'екты. Гэта прывяло да перанасычэння рынку. Летам і восенню ён працягваў папаўняцца ўсё новымі і новымі будынкамі, распавядае начальнік аддзела «Дамы, дачы, катэджы» ўпраўлення продажаў другаснага рынку жылля агенцтва «Твая сталіца» Алена АКУЛІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Слабенькія дачы — не ў фаворы

Сярод тых, хто жадаў прадаць дачу, былі людзі, якія змаглі павысіць свой жыццёвы статус, і танныя домікі іх ужо не цікавілі. Аднак асноўную масу прадаўцоў падштурхнуў распачаты летам бурны рост цэн на мінскія кватэры. У той час з'яўлялася ўсё больш і больш людзей, у якіх узнікала жаданне купіць кватэру. Ім патрэбны былі свабодныя грошы. Таму і так «раздзьмуты» да гэтага часу рынак стаў перанасычаны таннымі, да 10 тысяч долараў, дамамі, якія размешчаны на адлегласці ад Мінска ў радыусе 50-100 кіламетраў. Пералік падобнай прапановы мог літаральна «лопнуць». Цяпер асобныя агенцтвы нерухомасці вымушаны не браць такія аб'екты на продаж.

А вось рэальны попыт на садовыя домікі ўвогуле амаль знік. Частка людзей, якія мелі намер раней купіць «дачу», аддала перавагу звычайным домікам — няхай нават без выгод, але ў якіх можна жыць пастаянна. Ад'ехаўшы ад Мінска далей на 20 кіламетраў, за тыя ж грошы можна было купіць дом плошчай каля 70 «квадратаў, з печкаю і ўчасткам у 20 сотак. У людзей памяняліся каштоўнасці, і «дачы» засталіся незапатрабаванымі. Праўда, гэта не тычыцца будынкаў бізнес- і камфорт-класа, якія запатрабаваны на рынку заўсёды.

Яшчэ вясной спецыялісты казалі пра тое, што імклівы рост кошту кватэр немінуча закране і загародны рынак, і цэны пачнуць расці. Але гэтага не адбылося: сёлета не выраслі цэны нават на дамы паблізу ад Мінска. Цяпер цэны на дамы застаюцца на мінімальным узроўні. Часам кліент не можа прадаць дом агульнай плошчай 250 квадратных метраў з усімі выгодамі ў Хацежыне нават за 165 тысяч долараў. А гэта прыкладна цана чатырохпакаёвай кватэры ў Мінску, плошча якой у любым выпадку не будзе дасягаць 250 «квадратаў». Разам з тым, сёння эксперты асцерагаюцца, што плаўнае зніжэнне цэн на мінскія кватэры можа закрануць і рынак загараднага жылля. Тады сітуацыя на гэтым рынку яшчэ больш пагоршыцца.

З іншага боку, сёння складана знайсці добры і танны дом плошчай 100-150 кв.м. Таму добрыя дамы эканом-класа могуць дыктаваць цэны на рынку і ў бліжэйшай перспектыве.

А вось цэны на садовыя домікі, з прычыны празмернасці прапановы, упалі і будуць зніжацца далей, упэўнены спецыялісты. На іх думку, цяпер шматлікія прадаўцы робяць вялікую памылку, калі прытрымліваюць продаж сваіх дач да вясны.

СТАР.2

■ Да ведама

ПАЧЫМ ЦЯПЕР БІЛЕТ НА ПРЫГАРАД?

З 1 снежня пасажыры, што карыстаюцца прыгарадным транспартам, будуць аплачваць праезд па новых тарыфах. Датычыцца гэта аўтамабільных перавозак у рэгулярных зносінах, якія абслугоўвае транспарт дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс».

Цяпер адзін кіламетр праезду на звычайных маршрутах у аўтобусах агульнага тыпу будзе каштаваць 414 рублёў, у аўтобусах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі — 428 рублёў. На хуткасных маршрутах давядзецца плаціць, адпаведна, 538 і 556 рублёў за адзін кіламетр. На дадатковых рэйсах кошт аднаго кіламетра праезду ў аўтобусах агульнага тыпу складзе 558 рублёў, у аўтобусах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі — 578 рублёў.

На экспрэсных маршрутах, у тым ліку тых, якія абслугоўваюцца аўтобусамі з дазволенай максімальнай масай менш за 5 тон, тарыф на праезд будзе наступным: у аўтобусах агульна тыпу — у памеры 620 рублёў, у аўтобусах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі — у памеры 642 рублі.

На аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах на прыгарадным маршруце №468Э «Мінск — Рудзенск — Праўдзінскі» кошт праезду ўстанаўліваецца ў памеры 368,8 рубля за адзін кіламетр праезду.

На прыгарадных экспрэсных маршрутах, якія абслугоўваюць аўтобусы з дазволенай максімальнай масай менш за 5 тон, будуць дзейнічаць наступныя тарыфы: «Мінск (АВ «Маскоўскі») — Лагойск» — 384,6 рубля; «Мінск («АВ «Маскоўскі») — Жодзіна» — 415,1 рубля; «Мінск (В. Харужай) — «Пас.«Бальшавік» — 557,4 рубля за адзін кіламетр праезду.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ГРУЗІЯ ПАРАФІРАВАЛА ПАГАДНЕННЕ АБ АСАЦЫЯЦЫІ З ЕС

У Вільнюсе, дзе праходзіць саміт «Усходняга партнёрства», адбылося тэхнічнае парафіраванне пагаднення аб асацыяцыі Грузіі з Еўрасаюзам, перадаюць інфармагенцтвы. Згодна з абавязацельствамі, якія ўскладаюцца гэтым пагадненнем на Грузію, краіна павінна прывесці сваю прававую прастору ў адпаведнасць з заканадаўствам ЕС, а таксама ўзмацніць адпаведныя інстытуты. Часткай дагавора з'яўляецца пагадненне аб свабодным гандлі. Падпісанне пагаднення аб асацыяцыі Грузіі з Еўрасаюзам чакаецца ўвосень 2014 года.

АБ'ЯДНАННЕ З МАЛДОВАЙ — НОВЫ ФУНДАМЕНТАЛЬНЫ ПРАЕКТ РУМЫНІІ

Новым фундаментальным дзяржаўным праектам Румыніі стане аб'яднанне з Малдовай. Пра гэта прэзідэнт Румыніі Траян Бэсеску заявіў у эфіры нацыянальнага тэлебачання. «Першым фундаментальных дзяржаўным праектам Румыніі было ўступленне ў НАТА. Другім — уступленне ў ЕС. Трэцім павінна стаць аб'яднанне з Малдовай! Бясспрэчна!» — сказаў Бэсеску.

«Народ, які хоча быць разам, ніколі не здасца. Я не бяру ў разлік палітыкаў. Усе мае дзеянні, якія мелі дачыненне да Малдовы, былі звязаны з ідэяй аб магчымым аб'яднанні. Ведаю, што зараз не той момант. Але гэта адбудзецца», — працягнуў прэзідэнт. Паводле апублікаваных на гэтым тыдні вынікаў апытання, праведзенага румынскай службай INSCOP Research, у аб'яднанне з Малдовай вераць каля 25% румын, яшчэ столькі ж перакананa, што гэтая краіна ўступіць у ЕС. У той жа час 28% лічаць, што ў рэгіёне не будзе ніякіх геапалітычных зменаў.

РАСТВАРАЛЬНЫЯ ЛЕКІ ПАГРАЖАЮЦЬ ІНСУЛЬТАМ І ПРЫСТУПАМ?

Звычайныя абязбольвальныя могуць прыводзіць да інсультаў і сардэчных прыступаў з-за павышанай колькасці солі, папярэджвае Універсітэцкі каледж Лондана і Універсітэт Дандзі. Як адзначае The Daily Mail, пацыенты, якія рэгулярна прымаюць растваральныя формы аспірыну, парацэтамолу і ібупрафену, на 22% часцей пакутуюць ад інсультаў і ў сем разоў часцей атрымліваюць гіпертанію. Рызыка заўчаснай смерці павышаецца на 28%.

Некаторыя абязбольвальныя змяшчаюць у сабе на 50% больш солі ў параўнанні з рэкамендаванай дзённай дозай для дарослага чалавека, роўнай 6 грамам солі. Навукоўцы заклікаюць фармацэўтычныя кампаніі змяніць этыкеткі прэпаратаў, размясціўшы адпаведнае папярэджанне. А пацыентам яны параілі адмовіцца ад растваральных версій прэпаратаў.

НА КАМПЕНСАЦЫІ ПАЦЯРПЕЛЫМ АД АБВАЛУ ГЦ У РЫЗЕ ВЫДАТКАВАЛІ 21 МІЛЬЁН ЕЎРА

З бюджэту Латвіі выдаткавалі 15 мільёнаў латаў (21 мільён еўра) на кампенсацыі пацярпелым і сем'ям загінулых пры абрушэнні рыжскага гандлёвага цэнтра «Maxima». Пра гэта паведамляе Mixnews. Адпаведнае рашэнне прыняў латвійскі парламент. Раней урад устанавіў, што памер кампенсацый складзе 10 тысяч латаў (14 тысяч еўра) для сем'яў загінулых і 5 тысяч латаў — для пацярпелых. Аналагічныя сумы, як адзначае партал, людзям выплаціць і Рыжская дума.

Гандлёвая сетка «Maxima Latvija» плануе, са свайго боку, выплаціць больш за мільён латаў (1,4 мільёна еўра) дзецям загінулых у выніку надзвычайнага здарэння. Падтрымліваць сірот абяцаюць таксама кампаніі заказчыка будаўніцтва будынка гандлёвага цэнтра і падрадчыка.

КАРОТКА

Інфармацыя аб абмежаванні імпарту лекавых сродкаў у Беларусі, якая з'явілася ў некаторых інтэрнэт-крыніцах, не адпавядае рэчаіснасці, паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя.

Колькасць насельніцтва краіны на 1 лістапада склала 9 млн 467,2 тыс. чалавек.

Увод жылля ў Мінску ў студзені — кастрычніку гэтага года павялічыўся на 22 працэнты ў параўнанні з аналагічным перыядам 2012-га (898,2 тыс.кв.м агульнай плошчы супраць 165 тыс.кв.м).

Больш за 30 дадатковых цягнікоў будуць курсіраваць па беларускай чыгунцы ў дні навагодніх і калядных свят.

Званне ганаровага грамадзяніна Гомеля прысвоена вядомаму беларускаму мастаку Гаўрылу Вашчанку.

Камета ISON Зямлі не пагражае

Яна можа стаць незабыўным відовішчам стагоддзя

Астраномы ўсяго свету гэтымі днямі асабліва ўважліва сочаць за каметай Ison, якая 28 лістапада наблізілася да Сонца так блізка, што ёй пагражае небяспека, паведамляюць РІА Навіны.

Цяпер адлегласць ад Ison да сонца складае крыху больш за 1 млн кіламетраў, што ў 150 разоў бліжэй, чым ад сонца да Зямля. Камета праляціць міма Сонца з хуткасцю 380 км у секунду. Пры гэтым уплыў зоркі на камету будзе такі вялікі, што Ison пагражае гібель. Астраномы заяўляюць, што верагоднасць разбурэння кометы пад уплывам высокіх тэмператур і гравітацыі Сонца складае 60-70%. Калі Ison вырвецца з «абдымкаў» Сонца цэлай і здаровай, то тады зямлян чакае незабыўнае відовішча. У гэтым выпадку ISON можа стаць кометай стагоддзя: па яркасці з ёй нельга будзе параўнаць ніякую іншую.

Паводле паведамленняў інфармагенцтваў, камета, якая набліжаецца да Сонца, у апошнія некалькі гадзін (на раніцу чацвярга) «успыхнула», рэзка павялічыўшы сваю яркасць, і цяпер яе бляск адпавядае бляску самай яркай зоркі на небе — Сірыуса, а тэмпература на яе паверхні ў бліжэйшы час перавысіць 2,7 тысячы градусаў. Нагрэтая Сонцам, камета будзе свяціцца так ярка, што яе гіганцкі хвост можна ўбачыць з Зямлі няўзброеным вокам. Гэта адбудзецца 3 снежня. Як рэкамендуюць астраномы, назіраць за Ison можна ў перадсвітальны час у Паўночным паўшар'і. А вось зараз назіраць за каметай аматарам не рэкамендуецца, лічыць прэс-сакратар Пулкаўскай абсерваторыі Сяргей Смірноў, бо гэта небяспечна для зроку.

Камета ISON была адкрыта 21 верасня 2012 года беларускім і расійскім астраномамі Віталем Неўскім і Арцёмам Навічонкам у абсерваторыі каля Кіславодска.

Многія астраномы мяркуюць, што камета ISON не вытрымае ўздзеяння гравітацыі Сонца і тэмпературы амаль у 3 тысячы градусаў і разбурыцца.

Калі ж усё будзе развівацца па добрым для кометы сцэнарыі, то 29 снежня нябеснае цела праляціць міма Зямлі. Небяспекі для планеты і яе жыхароў яна не ўяўляе. Дарэчы, ядро кометы мае памер у папярочніку каля 5-6 кіламетраў, а газавая абалонка распасціраецца на 5 тысяч кіламетраў, што ў 1,2 раза шырэй за Аўстралію.

Сяргей КУРКАЧ.

ISSN 1990 - 763X

ЗМЕНЫ Ў ПРАЦОЎНЫ КОДЭКС...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Змены, якія ўносяцца ў артыкул 48, удакладняюць, што пры скасаванні працоўнага дагавора ў сувязі з парушэннем наймальнікам працоўнага заканадаўства, калектыўнага або працоўнага дагавора работніку выплачваецца выхадная дапамога ў памеры не менш за двухтыднёвы сярэдні заробак. Выключэнне складаюць работнікі, якім устаноўлена выплата мінімальнай кампенсацыі ў памеры трох сяреднямесячных заробкаў за скасаванне тэрміновага працоўнага дагавора з-за невыканання ці неналежнага выканання яго ўмоў па віне наймальніка.

Устаноўлена дадатковая падстава спынення працоўнага дагавора з дзяржаўнымі службовымі асобамі, якія адмовіліся падпісаць пісьмовае абавязацельства па выкананні абмежаванняў, якія прадугледжаны законам аб барацьбе з карупцыяй, або парушылі такое абавязацельства.

Прафесійны спорт

Новай нормай Працоўнага кодэкса з'яўляецца глава, якая рэгулюе працоўныя адносіны ў прафесійным спорце. Яна распрацавана па ініцыятыве старшыняў шэрагу спартыўных федэрацый, асацыяцый, саюзаў і па даручэнні Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Пры распрацоўцы ўлічваўся досвед Расійскай Федэрацыі, бо падобная глава ёсць там у Працоўным кодэксе з 2008 года.

Важна разумець, што працоўныя адносіны ў прафесійным спорце арыентаваны на вынікі, спартыўныя дасягненні, дысцыпліну як з боку спартсмена, так і з боку трэнера. Таму, апроч агульных падстаў спынення працоўнага дагавора, прадугледжаных Кодэксам, прапануюцца дадатковыя падставы — такія, як спартыўная дыскваліфікацыя, выкарыстанне допінгу ў спорце, недасягненне пэўных спартыўных вынікаў, пры ўмове, што дасягненне гэтых вынікаў было прадугледжана працоўным дагаворам і спартсмену былі створаны найбольш неабходныя ўмовы.

Зняты абмежаванні па гранічных нормах падымання і перамяшчэння цяжару жанчынамі-спартсменкамі і спартсменамі маладзей за 18 гадоў, калі гэта прадугледжана планам падрыхтоўкі да спаборніцтваў і не забаронена па стане здароўя спартсмена. Акрамя таго, дазваляецца прыцягненне непаўналетніх да звышурочнай працы, працы ў начны час, у дзяржаўныя святы, святочныя і выхадныя дні з іх пісьмовай згоды, а ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў — з пісьмовай згоды аднаго з бацькоў.

Глава таксама прадугледжвае магчымасць замацавання ў працоўным дагаворы па дамове бакоў абавязку спартсмена, трэнера выплаціць наймальніку грашовую кампенсацыю ў выпадку скасавання працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка пры наяўнасці віны спартсмена або трэнера. Памер грашовай кампенсацыі і парадак яе выплаты будзе вызначацца працоўным дагаворам.

У той жа час законапраект прадугледжвае дадатковыя гарантыі і кампенсацыі спартсменам і трэнерам, якія ўстаноўлены калектыўнымі, працоўнымі дагаворамі і іншымі лакальнымі нарматыўна-прававымі актамі. Напрыклад, забеспячэнне правядзення аднаўленчых мерапрыемстваў у мэтах умацавання здароўя спартсмена, выплата дадатковых кампенсацый у сувязі з пераездам на працу ў іншую мясцовасць, харчаванне і сацыяльна-бытавое абслугоўванне за кошт наймальніка падчас удзелу ў спаборніцтвах, кампенсацыя транспартных выдаткаў.

Не толькі дома

Для пашырэння магчымасцяў па арганізацыі надомнай працы праектам закона ўносяцца змены ў артыкул 304, якія прадугледжваюць магчымасць выкарыстання работнікам-надомнікам таксама сваіх матэрыялаў, абсталявання, прылад, механізмаў і дазваляюць выконваць працу па-за месцам жыхарства.

У адрозненне ад дзейснай нормы, законапраектам захоўваецца абмежаванне працы па сумяшчальніцтве толькі для кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый, а таксама кіраўнікоў недзяржаўных арганізацый, у статутным фондзе якіх доля дзяржаўнай уласнасці складае не менш чым 50%. Удакладняюцца нормы, якія дазволяць работніку працаваць на некалькіх прадпрыемствах, у выхадныя дні, у адпачынку пры вымушаным прастоі прадпрыемства.

Для паляпшэння ўмоў вядзення бізнесу і спрашчэння бухгалтарскага ўліку законапраект адмяняе абавязковае запаўненне камандзіровачных пасведчанняў, за выключэннем выпадкаў, калі такое пасведчанне з'яўляецца дакументам, які гарантуе дадатковыя правы пэўным катэгорыям работнікаў (супрацоўнікі сістэмы МУС, КДБ, пракуратуры і іншым).

Выключаны артыкул 316 Працоўнага кодэкса, які вызначае працягласць штодзённай працы работнікаў будаўніча-мантажных арганізацый не больш за 10 гадзін пры падсумаваным уліку працоўнага часу, у той час як артыкул 126 пры тых жа ўмовах устанаўлівае 12 гадзін. Гэта забяспечвае агульныя падыходы да ўжывання падсумаванага ўліку працоўнага часу.

Законапраект спрашчае для наймальніка працэдуру ўзгаднення з работнікам чарговасці прадастаўлення працоўных адпачынкаў.

Празрыстасць

Шэраг змен выцякаюць з жыцця. Правілы скасавання працоўнага дагавора, якія ўжываюцца пры ліквідацыі арганізацыі, прапануецца распаўсюдзіць таксама і на спыненне дзейнасці філіяла, прадстаўніцтва ці іншага адасобленага структурнага падраздзялення арганізацыі, якое размешчана ў іншай мясцовасці.

Новая рэдакцыя 69 артыкула ўстанаўлівае больш празрысты механізм кампенсацыі за працу ў звышурочны час, у дзяржаўныя святы, святочныя і выхадныя дні. У прыватнасці, памер даплаты за гэты час не можа быць ніжэй за здзельныя расцэнкі, аклады, канкрэтныя памеры, якія азначаны працоўным дагаворам ці лакальным нарматыўным прававым актам, а для бюджэтнікаў — устаноўленых урадам Рэспублікі Беларусь.

Шэраг удакладненняў датычыцца адпачынкаў па доглядзе дзіцяці, дадатковага свабоднага ад працы дня, выхадных дапамог, праходжання медаглядаў. З улікам законапраекта пра донарства крыві і яе кампанентаў, над якім працуе дэпутацкі корпус, уносяцца змены ў артыкулы, якія рэгулююць працоўныя адносіны з донарамі.

Паводле дзейнага заканадаўства, наймальнік не можа звольніць адзінокую маці, якая выхоўвае дзіця ва ўзросце да 14 гадоў ці дзіця-інваліда — да 18 гадоў, якая па стане здароўя не можа працягваць працаваць, а ў наймальніка няма магчымасці перавесці яе на іншую працу. Тое тычыцца цяжарнай жанчыны, жанчыны, якая выхоўвае малалетніх дзяцей, пры змене ўласніка маёмасці арганізацыі, накіравання работніка па пастанове суда ў лячэбна-працоўны прафілакторый і іншых акалічнасцях. У законапраекце ўдакладняецца пералік падстаў, якія дазваляюць скасаваць працоўны дагавор з жанчынамі, якія маюць дзяцей.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Сітуацыя

НАСУПЕРАК БІЗНЕС-ПЛАНУ

Камітэт дзяржкантролю Гомельскай вобласці праверыў адно з самых буйных прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання Гомеля, якое аказвае ўвесь комплекс цырульных паслуг, — таварыства «Локан», дзе амаль 70% акцый належаць Гомельскаму гарвыканкаму. Вынікі несуцяшальныя.

Выяўлены шэраг недаглядаў з боку кіраўніцтва акцыянернага таварыства, а таксама фармальны падыход органа дзяржаўнага нагляду, у ролі якога выступае гарадское ўпраўленне гандлю. З яго маўклівай згоды «Локанам» у 2012 годзе было закрыта тры цырульні з шаснаццаці. Пры гэтым у двух памяшканнях, дзе раней знаходзіліся цырульні таварыства «Локан», цяпер паспяхова аказваюць цырульныя паслугі прадпрымальнікі.

Згортванне таварыствам сваёй сеткі цырульняў не прадугледжвалася бізнес-планам развіцця і ідзе насуперак асноўнай стратэгіі, накіраванай на нарошчванне паслуг у гэтым сегменце рынку і павышэнне канкурэнтаздольнасці, падкрэсліваюць кантралёры. Акрамя таго, таварыствам дапушчалася невыкананне і іншых пунктаў бізнес-плана, што прывяло да неэфектыўнага выкарыстоўвання асноўных сродкаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■ Тры пытанні да ўлады

ДАРОГА ДА ХРАМА ПРАЛЯГАЕ ПРАЗ ДУШЫ

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

У Маскоўскім раёне Брэста прайшоў першы этап акцыі «Храм маёй душы» па рэканструкцыі Свята-Уваскрэсенскага сабора. Пра гэты праект, а таксама іншыя пытанні добраўпарадкавання наша сённяшняя гутарка з кіраўніком адміністрацыі Маскоўскага раёна Аляксандрам РАГАЧУКОМ.

— Аляксандр Сцяпанавіч, акцыя «Храм маёй душы» мела і мае вялікі грамадскі рэзананс у абласным цэнтры. Пра якія, няхай сабе і прамежкавыя, вынікі яе можна сказаць?

— Самы вялікі і прыгожы храм нашага раёна — Свята-Уваскрэсенскі сабор — пабудаваны адносна нядаўна, менш за дваццаць гадоў таму. Але пры яго будаўніцтве не былі захаваны некаторыя тэхналагічныя тонкасці. Напрыклад, ацынкаваныя пліты, якія пакрывалі дах, пачалі ржавець. Справе разбурэння паспрыяла і адсутнасць прадушын у драўляных канструкцыях купалаў. Адным словам, храму патрабавалася сур'ёзная рэканструкцыя. І адміністрацыя Маскоўскага раёна распачала духоўна-асветніцкую акцыю «Храм маёй душы». Быў адкрыты рахунак. І да збору сродкаў далучыліся дзясяткі прадпрыемстваў, сотні людзей.

Мне вельмі прыемна, што на заклік адгукнуліся многія і многія гараджане. Сродкі паступалі ад буйных і сярэдніх прадпрыемстваў, прыватных кампаній, індывідуальных прадпрымальнікаў. Актыўна ўдзельнічалі і школьнікі: хлопчыкі і дзяўчынкі з многіх устаноў адукацыі збіралі другасную сыравіну, а грошы ад яе накіроўвалі ў агульную грамадскую скарбонку. У агітацыйнай дзейнасці за збор сродкаў рабіўся акцэнт на тое, што тады мы можам адчуць сябе паўнацэннымі гараджанамі, калі па закліку ўласнай душы далучымся да агульнай добрай справы. І нам многае ўдалося. Гэта, так бы мовіць, адзін з духоўных вынікаў кампаніі.

Вынікі, практычны і эстэтычны, можа ўбачыць кожны. Менш за год спатрэбілася, каб сабраць сродкі, прыкладна два мільярды рублёў, і «пазалаціць» купалы. Іх абліцавалі пласцінамі з нержавеючай сталі, пакрылі спецыяльным саставам, які надае металу залацісты колер, і яны заззялі. Паглядзіце, які прыгожы і ўрачысты стаў адразу наш сабор! Купалы відаць цяпер здалёк. Наступны этап рэканструкцыі — рамонт даху, які мяркуецца правесці за кошт ахвяраванняў прыхаджан. Добраахвотныя ўзносы працягваюць паступаць на рахунак.

— Якія яшчэ праекты па добраўпарадкаванні ажыццяўляюцца ў раёне апошнім часам?

— Найперш я назваў бы парк воінаў-інтэрнацыяналістаў. Там зараз вядзецца вялікая работа па рамонце, замене пляцовак, дарожак, месцаў адпачынку. Поўнасцю будзе абноўлены помнік воінам-інтэрнацыяналістам. На жаль, ён быў узведзены ў свой час з нетрывалых матэрыялаў, таму помнік давялося перарабляць поўнасцю.

Вялікая работа вядзецца ў кварталах новай забудовы, перш за ўсё зарэчнай часткі раёна, дзе асабліва хутка развіваецца горад. У раёне гіпермаркета «Еўраопт» абсталявана прыгожае месца адпачынку, літаральна гэтай вясною пасаджана алея з цюльпанамі. Стараемся ажыўляць новыя забудовы малымі архітэктурнымі формамі, невялікімі прыгожымі будынкамі. Працуем над падсветкай, асабліва на святы. Перад Новым годам, згадзіцеся, усе павінны адчуць, што набліжаецца свята.

— У новых раёнах аб добраўпарадкаванні клапоціцца ўлада, у дамах і дварах ЖРЭУ — камунальныя службы, а як спадзвігнуць на гэту работу жыхароў кааператываў, калі дому ад 20 да 40 гадоў?

— Гэта надзвычай балючае пытанне. Многія дамы маюць патрэбу ў капітальным рамонце, які кааператывам проста не пад сілу. Адзін з варыянтаў, які ім прапануюваецца, — перайсці на абслугоўванне ў ЖРЭУ. Але людзі ідуць на гэта неахвотна. Калі ж гаворку весці пра рамонт і добраўпарадкаванне, стан спраў цалкам залежыць ад умення насельніцтва самаарганізавацца. Вышэйшы орган кааператыву — сход. Жыльцы могуць і павінны прыняць рашэнне аб рамонце, добраўпарадкаванні і правесці гэтую работу. Нават прыняць рашэнне і перайсці на баланс ЖРЭУ павінен агульны сход. Але ўсяму перашкодай нярэдка становіцца пасіўнасць, абыякавасць. Ці шмат ахвотных знойдзецца ў кааператыве выйсці папрацаваць на карысць свайго двара альбо пад'езда? Пакуль не навучымся быць гараджанамі, якія любяць свой горад, адчуваюць за яго адказнасць, цяжка будзе дабіцца поўнага парадку ва ўсіх дварах, на ўсіх тэрыторыях. Рана ці позна жыццё прымусіць спасцігнуць гэту простую рэч.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Надвор'е

ГАЛАЛЁД І СЛАБАЯ МЯЦЕЛІЦА

Напрыканцы тыдня на тэрыторыі Беларусі чакаецца ветранае і няўстойлівае надвор'е, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

У пятніцу да нас завітаюць атмасферныя франты з боку Балтыйскага мора, таму ў многіх раёнах краіны чакаецца мокры снег, месцамі — слабая мяцеліца. На асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень ад мінус 2 да плюс 2 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 4 цяпла. Уначы на суботу будзе практычна без ападкаў, толькі раніцай па паўднёвым захадзе прагназуецца снег. Удзень снег і мокры снег будзе ісці ў многіх раёнах Беларусі. На дарогах на працягу сутак магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ў ноч на суботу будзе вагацца ад 0 да 5 марозу, па паўночным усходзе — да мінус 6-10 градусаў; толькі на захадзе Брэсцкай вобласці — да плюс 1 градуса. Удзень у суботу чакаецца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

У першы дзень зімы франтальны раздзел з боку Польшчы прынясе да нас снег, мокры снег, а на захадзе краіны — мокры снег з дажджом. Месцамі чакаецца галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Узмоцніцца вецер: яго парывы будуць дасягаць да 15-18 м/с. У ноч на нядзелю тэмпературны фон крыху павялічыцца: калі ноччу чакаецца ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, то ўдзень — ужо ад 0 да плюс 5 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня Беларусь трапіць пад уплыў паветраных мас атлантычнага паходжання. Таму ў ноч на панядзелак амаль паўсюдна, а ўдзень месцамі чакаецца снег і мокры снег. Мінімальная тэмпература паветра ў ноч на панядзелак ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 2 да 4 цяпла. Сіноптыкі прагназуюць, што да сярэдзіны наступнага тыдня ападкаў у выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу стане значна менш. Тэмпература ўначы будзе ад мінус 6 да плюс 3 градусаў, удзень — ад 1 марозу да 5 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ

ЗАГАРАДНЫЯ ДАМЫ І ДАЧЫ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ТАННЕЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Зразумела, што вясной пакупніцкі попыт вырасце прыкладна на 20%. Але прадаўцы таксама актывізуюцца. Іх стане прыкладна ў тры разы больш. Што ў гэтым выпадку можна параіць патэнцыяльным прадаўцам? Алена Акуліч адзначае, што попыт на загарадную нерухомасць захоўваецца на пэўным узроўні. Падобныя аб'екты як прадаваліся, так і прадаюцца. Іншая справа, што рэалізоўваць іх становіцца ўсё складаней. Сёння прадаюцца ці танныя аб'екты, ці сапраўды якасныя. Але такія варыянты на рынку цяпер «вымываюцца».

Праблемныя ўчасткі прадаюць за бесцань

Цяпер на зямельным рынку назіраецца парадокс, калі цэны на ўчасткі «з-пад малатка» павялічыліся, а на «другасным рынку» яны падаюць.

Вядома, што пераацэнка зямель у Мінску і Мінскім раёне прывяла да павелічэння кадастравага кошту зямельных участкаў. Менавіта ён пакладзены ў аснову вызначэння пачатковых цэн на ўчасткі, якія прапануюцца на аўкцыёнах. Але гэта не перашкаджае пакупнікам таргавацца практычна па кожным лоце. З таргоў «сыходзяць» участкі ў новых масівах, без камунікацый. Тут у пакупніко ёсць надзея на тое, што мясцовыя ўлады з часам вырашаць гэту праблему і ў вёсках і пасёлках з'явіцца добрая інфраструктура, у тым ліку электрычнасць, вада і газ.

Што да ўчасткаў на другасным рынку жылля, то цяпер назіраецца новая тэндэнцыя, калі ў агенцтвы нерухомасці звяртаецца ўсё больш прадаўцоў, над якімі навісла пагроза канфіскацыі зямельных участкаў за нясвоечасовае іх засваенне. Такім уладальнікам нічога не застаецца рабіць, як прадаваць зямельныя ўчасткі па дэмпінгавых цэнах. Тое, што прапаноўвалася раней за 20 тысяч, зараз аддаюць за 5—7 тысяч долараў. Аднак трэба яшчэ добра пастарацца, каб адшукаць пакупніка на ўчастак і каб той змог на працягу месяца прыступіць да будаўніцтва. Праблема ў тым, што тэрмін, адведзены на ўвядзенне дома ў эксплуатацыю, хутка скончыцца. Таму цэны на такія ўчасткі і зніжаюцца. Зразумела, што ў добраўпарадкаваных населеных пунктах няма сапраўды масавага продажу праблемных участкаў. Гэта больш тычыцца аддаленых і неперспектыўных месцаў.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Педсавет

ЗВЕРЫМ ГАДЗІННІКІ Ў СІСТЭМАХ АДУКАЦЫІ

Уявіце сабе карабель, які плыве ў адкрытым акіяне, у тумане, без навігацыйнай карты, без арыенціраў, не сустракаючы на сваім шляху іншыя судны. Ці могуць яго пасажыры быць упэўненымі, што карабель рухаецца ў правільным напрамку? А як можна быць упэўненым, што сістэма адукацыі развіваецца ў правільным кірунку, не параўноўваючы свае поспехі з адукацыйнымі дасягненнямі іншых краін?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Мы — не яны

Год таму на постсавецкай прасторы была створана Еўразійская асацыяцыя ацэнкі якасці адукацыі. Адным з ініцыятараў стварэння гэтай арганізацыі стаў **міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ.** Нядаўна ў Мінску пад эгідай Еўразійскай асацыяцыі ацэнкі якасці адукацыі прайшла міжнародная канферэнцыя «Маніторынгі школьнай адукацыі: перспектывы супрацоўніцтва паміж краінамі» з удзелам вучоных і практыкаў з Беларусі, Арменіі, Казахстана, Расіі, Узбекістана, Таджыкістана і Чэхіі.

Сяргей Маскевіч падкрэсліў, што ў кожнай краіны — свае каштоўнасныя арыенціры і задачы, якія ставіць дзяржава перад сістэмай адукацыі. Але для ўсіх важна не згубіць канкурэнтаздольнасць гэтай сістэмы.

— Сёння ва ўсім свеце робіцца стаўка на незалежную сістэму ацэнкі якасці адукацыі. І самыя паспяховыя краіны — тыя, дзе дзейнічае вялікая аўтаномія ўстаноў адукацыі пры сур'ёзнай знешняй ацэнцы дзейнасці гэтых устаноў. У міжнародных рэйтынгах лідзіруючыя пазіцыі займаюць Фінляндыя і Сінгапур. Але пры ўсёй павазе да калег мы не можам аўтаматычна перакласці на Расію ці Беларусь вопыт Сінгапура — гэта зусім іншы менталітэт і іншае стаўленне сям'і да адукацыі, — тлумачыць сваё бачанне сітуацыі **віцэ-прэзідэнт Расійскай акадэміі адукацыі і старшыня Еўразійскай асацыяцыі ацэнкі якасці адукацыі Віктар БОЛАТАЎ.** — Фінляндыя шмат гадоў таму пачала рэалізоўваць лозунг «Аднолькавая адукацыя для ўсіх». Але ў расійскіх умовах якасць адукацыі для народаў Поўначы, Масквы ці, скажам, жыхароў элітнага акадэмгарадка будзе азначаць рознае.

Не зразумелі: пра што пытаецеся?

Расія, у адрозненне ад Беларусі, прымае ўдзел ва ўсіх буйнамаштабных міжнародных даследаваннях TIMSS, PISA і PIRLS, якія ўзаемна дапаўняюць адно аднаго і даюць больш поўную інфармацыю аб сістэме адукацыі, ацэньваючы яе з розных бакоў. Для прыкладу, TIMSS дазваляе прасачыць тэндэнцыі ў развіцці матэматычнай і прыродазнаўчай адукацыі з 1995 года. Прызначэнне PISA заключаецца ў праверцы ўзроўню кампетэнтнасці 15-гадовых падлеткаў і іх гатоўнасці прымяняць атрыманыя ў школе веды і ўменні ў канкрэтных жыццёвых сітуацыях. І калі вынікі TIMSS сведчаць пра тое, што ўзровень прадметных ведаў і ўменняў расійскіх васьмікласнікаў не ніжэйшы або перавышае ўзровень навучэнцаў многіх краін, то вынікі PISA ўказваюць на тое, што **ў расійскіх школьнікаў ёсць праблемы з прымяненнем ведаў і навыкаў у штодзённым жыцці, у сітуацыях, якія выходзяць за рамкі вучэбных. Па функцыянальнай адукаванасці юныя расіяне значна адстаюць ад равеснікаў з большасці развітых краін свету...**

Эксперты тлумачаць гэты факт празмернай акадэмічнай скіраванасцю расійскай школы, тым, што вучні з былога Саюза больш прывыклі да сухіх і дакладных фармулёвак і заданняў кшталту «рашыць ураўненне», «спрасціць выраз», у той час як большасць заданняў міжнародных даследаванняў фармулюецца на аснове рэальных сітуацый. Перад выкананнем задання вучань павінен прачытаць нейкі сцэнарый і ўнікнуць у сутнасць задання. Але расійскія школьнікі, маючы патрэбныя веды і навыкі для таго, каб справіцца з заданнем, пакідаюць яго недачытаным з-за незвычайнасці сітуацыі ці недастатковага разумення прачытанага і таго, што ад іх патрабуецца.

Асабліва гэта тычыцца прыродазнаўчых дысцыплін, дзе для выканання заданняў з адкрытым адказам ад школьніка патрабуецца выкласці сваё меркаванне або апісаць нейкі «рэцэпт» рашэння прапанаванай праблемы. У яго цікавяцца: «Як, на твой погляд?», «Як табе падаецца?», «Што б ты прапанаваў?», «Што б ты параіў?». Для вучняў краін постсавецкай прасторы прайсці такі тэст куды больш складана, чым зрабіць шматкрокавыя разлікі з выкарыстаннем некалькіх формул. Таму **часта вучань, які засвоіў складаны тэарэтычны матэрыял, можа не адказаць на элементарнае пытанне кшталту: «А што б ты зрабіў, каб не заразіцца ад аднакласніка грыпам?»**

На думку Міхаіла Болатава, неабходнасць удзелу Расіі ў міжнародных даследаваннях абсалютна відавочная, паколькі ўсім важна ведаць сваё месца на сусветнай шкале дасягненняў. Але, з іншага боку, у буйнамаштабных даследаваннях параўноўваюцца сістэмы адукацыі вельмі розных краін, з рознымі традыцыямі ў выкладанні і выхаванні. Відавочная і неабходнасць усебаковага даследавання якасці адукацыі ў нацыянальным кантэксце, бо ненатуральным будзе ўдзел краіны ў чэмпіянаце свету па футболе, калі яна не праводзіць свой уласны нацыянальны чэмпіянат.

Падабенства сістэм і праграм школьнай адукацыі постсавецкіх краін абумоўліваюць і падобнасць праблем, з якімі ўсе мы сутыкаемся. Таму на постсавецкай прасторы трэба праводзіць яшчэ і свае даследаванні, падчас якіх можна паспяхова выкарыстоўваць метады міжнародных даследаванняў, але абапірацца на нацыянальныя асаблівасці.

Пяць прадметаў — за 3,5 гадзіны

Шмат увагі на канферэнцыі надавалася правядзенню нацыянальных экзаменаў. Пасля распаду Савецкага Саюза ўсе рэспублікі пачалі ўкараняць незалежныя працэдуры экзаменаў. Прычына — непразрыстая сістэма ўступных іспытаў у ВНУ, а галоўная задача — аб'ектыўная сертыфікацыя дасягненняў. Праўда, для таго, каб мець інфармацыйную бяспеку, кожная краіна распрацоўвае свае падыходы і прымяняе свае арганізацыйна-тэхналагічныя прыёмы пры правядзенні нацыянальных экзаменаў.

Так, у Арменіі тыраж і падрыхтоўка экзаменацыйных матэрыялаў ажыццяўляюцца за межамі краіны. Захоўванне экзаменацыйных матэрыялаў да правядзення экзамену адбываецца пры падтрымцы банкаўскай сістэмы краіны. Усе экзамены праводзяцца ва ўмовах аснашчэння кожнага экзаменацыйнага цэнтра тэхнічнымі сродкамі глушэння сувязі і відэаназірання. Ход правядзення экзаменаў у аўдыторыях шырока асвятляецца з дапамогай анлайн-трансляцый у агульнадаступных месцах.

Пры правядзенні нацыянальнага тэсціравання ў Казахстане захоўванне і дастаўка экзаменацыйных матэрыялаў ажыццяўляюцца пад кантролем Камітэта нацыянальнай бяспекі. Асаблівасцю правядзення адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет у Казахстане і Азербайджане з'яўляецца здача інтэграванага тэста адразу па чатырох—пяці дысцыплінах.

У Азербайджане адбор у ВНУ праводзіцца па чатырох групах спецыяльнасцяў на аснове інтэграванага тэста. Групы спецыяльнасцяў адрозніваюцца наборам экзаменацыйных прадметаў. Скажам, пры паступленні на гуманітарныя, педагагічныя спецыяльнасці, музыку і мастацтва абітурыенты здаюць родную мову, літаратуру, матэматыку, гісторыю і замежную мову. Увогуле матэматыку здаюць усе абітурыенты, незалежна ад выбару будучай прафесіі. Гэта зроблена для таго, каб сфарміраваць у вучняў сур'ёзнае стаўленне да ўсіх школьных дысцыплін, а не толькі да прадметаў, якія маюць непасрэднае дачыненне да будучай прафесіі...

Адзінае нацыянальнае тэсціраванне, якое праводзіцца ў Казахстане, спалучае выніковую атэстацыю выпускнікоў старэшай школы з уступнымі экзаменамі ва ўстановы больш высокай ступені навучання, а інтэграваны тэст уключае пяць вучэбных дысцыплін: казахскую, рускую мовы, матэматыку, гісторыю Казахстана і адзін з прадметаў у залежнасці ад абранай спецыяльнасці — па 25 заданняў з выбарам адказу на кожны прадмет. А для выпускнікоў папярэдніх гадоў і ўсіх, хто не праходзіў адзінае нацыянальнае тэсціраванне, праводзіцца комплекснае тэсціраванне па чатырох прадметах: казахскай ці рускай мове (у залежнасці ад мовы навучання), гісторыі Казахстана, матэматыцы і профільнай дысцыпліне. На правядзенне Адзінага нацыянальнага тэсціравання адводзіцца 3,5 гадзіны (або 210 хвілін).

— На тэсціраванні трэба набраць пэўную колькасць балаў, каб мець магчымасць прыняць удзел у конкурсе грантаў на бюджэтнае навучанне ў ВНУ, — расказаў **дырэктар Нацыянальнага цэнтра тэсціравання Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Казахстан Калі Сеільбекавіч АБДЗІЕЎ.** — Мінімальны прахадны бал для тых, хто паступае ў ВНУ, штогод змяняецца: у 2013 годзе гэта было 60 балаў са 125 магчымых.

Вучні з былога Саюза больш прывыклі да сухіх і дакладных фармулёвак і заданняў кшталту «рашыць ураўненне», у той час як большасць заданняў міжнародных даследаванняў фармулюецца на аснове рэальных сітуацый, дзе ад школьніка патрабуецца выказаць сваё меркаванне.

Адукацыйныя гранты размяркоўвацца цэнтралізавана, а ВНУ атрымлівае фінансаванне ў залежнасці ад таго, колькі абітурыентаў яе абралі. Натуральна, што «кошт» гэтага экзамену вельмі высокі, напэўна, таму і спрэчкі вакол яго не сціхаюць. **Па выніках нацыянальнага тэсціравання 2013 года ў адной з абласцей было прапанавана звольніць 27 дырэктараў школ — за тое, што ў іх навучальных установах ужо не першы год фіксаваліся нізкія вынікі. Разам з тым кіраўніцтва вобласці ўзнагародзіла 40 лепшых настаўнікаў грашовай прэміяй у памеры 1 млн тэнге — гэта прыкладна крыху больш за 6 тыс. долараў.**

Экзамен «з высокімі стаўкамі»

Дырэктар Федэральнага інстытута педагагічных вымярэнняў Расійскай Федэрацыі Аксана РАШЭТНІКАВА ўпэўнена, што вельмі многае залежыць ад карэктнага выкарыстання даных любых вымярэнняў, у тым ліку і вынікаў Адзінага дзяржаўнага экзамену (АДЭ). У адрозненне ад краін з развітымі сістэмамі стандартызаванага тэсціравання (такіх, як ЗША, Вялікабрытанія, Аўстралія), у савецкай школе стандартызаваныя тэсты практычна не прымяняліся. Паняцце «псіхаметрыка» было незнаёмае школьным настаўнікам і шырокаму колу спецыялістаў у галіне адукацыі. Таму **і сёння распаўсюджана меркаванне, што школьныя настаўнікі лепш за іншых могуць ацаніць веды сваіх вучняў.**

Акрамя таго, у Расіі хутка стала распаўсюджвацца практыка ацэнкі якасці работы настаўнікаў і школ на падставе вынікаў Адзінага дзяржаўнага экзамену пры атэстацыі педагогаў і акрэдытацыі школ. Вядомыя нават выпадкі жорсткіх санкцый, што прымяняліся да школ з боку вышэйшага кіраўніцтва. З паказчыкамі дзяржаўнага экзамену рабілі ўсё, што заўгодна. У выніку АДЭ стаў набываць форму ацэнкі «з высокімі стаўкамі» і сустрэў «гарачы адпор»...

Фактычна ў Расіі з моманту ўвядзення Адзінага дзяржаўнага экзамену апошні пазіцыянуецца як ацэначная працэдура, якая дазваляе атрымаць інфармацыю аб стане адукацыі ў краіне і рэгіёне, меркаваць аб тэндэнцыях у адукацыі і ствараць аснову для кіравання якасцю адукацыі на ўсіх узроўнях.

«Але нацыянальныя экзамены пры усёй сваёй маштабнасці не могуць задаволіць усе патрэбы сістэмы адукацыі і служыць такім розным мэтам: ажыццяўляць сертыфікацыю, адбор і атрымліваць зваротную сувязь ад сістэмы адукацыі. Для гэтага трэба праектаваць розныя па мэтах і статусе працэдуры», — упэўнена Аксана Рашэтнікава.

Што тычыцца аргументаў на карысць правядзення АДЭ, то дастаткова сказаць, што ў савецкія часы ва ўніверсітэтах і інстытутах Масквы і Ленінграда вучыліся толькі 25% жыхароў гэтых гарадоў, астатнія ж 75% складала моладзь з іншых рэгіёнаў краіны. Пасля перабудовы сітуацыя змянілася з дакладнасцю наадварот. І толькі пасля ўвядзення Адзінага дзяржаўнага экзамену колькасць іншагародніх студэнтаў у ВНУ буйных гарадоў стала перавышаць колькасць студэнтаў, якія жывуць у гэтым горадзе. Акрамя таго, на 15% павялічылася прадстаўніцтва сярод студэнтаў сельскай моладзі. Іншымі словамі, **вядучыя расійскія ВНУ пачалі працаваць для ўсёй краіны...**

Надзея НІКАЛАЕВА

■

ТВ@Р

Алена СПІРЫДОВІЧ:

«Калі муж робіць нешта добрае, адразу пачынаю гатаваць шарлотку»

З 30 лістапада ў эфіры тэлеканала «Беларусь 2» стартуе працяг кулінарна-гістарычнага шоу «Беларуская кухня». Праект знаёміць гледачоў з рэцэптамі беларускай нацыянальнай кухні — ад тых, хто і ў нашы дні гатуе, не адступаючы ад традыцый. Даследаваць іх у кулінарным шоу будзе этнограф Ларыса Мятлеўская, для якой кожны выпуск — непаўторная экспедыцыя ў беларускую глыбінку. Віртуозны повар Вартан навучыць гатаваць па бабуліных рэцэптах на сучаснай кухні, а элегантная гаспадыня Алена Спірыдовіч будзе дапамагаць слушнымі парадамі ў стварэнні кулінарных шэдэўраў. У размове вядучая падзялілася ўражаннямі, якія застаюцца за кадрам, парадамі з уласнай калекцыі і сакрэтам імправізацыі на кухні.

Фота Цімафея ГАМЗУНОВА.

— Якім вяртаецца да гледачоў праект «Беларуская кухня»?

— Ведаеце, ёсць праграмы і праекты, пра якія я кажу: усё будзе добра, калі нічога не будзе змяняцца. Мы працягваем наша падарожжа па гісторыі беларускай кухні. Гэта ж бяздонны калодзеж, адкуль яшчэ чэрпаць і чэрпаць. Тут і вучыцца і здзіўляцца можна, што мы і робім на здымках. Калі б мне прапанавалі весці проста кулінарнае шоу, то, хутчэй за ўсё, не пагадзілася б, таму што проста гатаваць нешта мне сумна. Я і дома магу так рабіць. Зараз шмат шоу такой тэматыкі існуе. Мне падабаецца некаторыя з іх глядзець і вучыцца чамусьці новаму. Аднак у нас жа ўсё завязана на славянскіх святах, традыцыях, на ўспамінах «з глыбінкі».

У большасці з нас ёсць ці была бабуля ў вёсцы, да якой мы прыязджалі на лета. І там заўсёды ўмелі прыгатаваць нешта такое смачнае, чаго не рабіла маці. У мяне бацька родам з Беразіно, і калі я прыязджала да сваёй бабулі, яна частавала мясцовымі прысмакамі. Але я была вельмі малой, каб распытваць пра тыя рэцэпты, запамінаць іх альбо запісваць. А зараз нібы

Тыя ж спецыі сёння ў горадзе можна набыць любыя, а на вёсцы, як кажуць бабулі, «кроп усім запраўляе».

зноў вяртаюся ў дзяцінства, успамінаю нешта. Калі да мяне прыйшлі маладыя людзі з ідэяй рабіць такі праект, то згадзілася не раздумваючы. Адразу спытала пра пачатак здымак — настолькі мне было цікава. Вось ужо некалькі гадоў праграма існуе. На жаль, былі перапынкі, але зараз мы зноў вяртаемся да сваёй аўдыторыі.

— І як адбываецца працэс запісу?

— Звычайна здымкі пачынаюцца ў дзесяць гадзін раніцы і цягнуцца да дзесяці вечара. У дзень запісваем дватры выпускі праграмы. Падчас здымак, пакуль чакаем прыгатавання той ці іншай стравы ці інгрэдыенту, шмат размаўляем, дзелімся рознымі парадамі. Я пачала гатаваць з большым захапленнем. Мой таварыш па кухні, повар Вартан, як і я, шмат падарожнічае. Таму пры сустрэчы мы абмяркоўваем нейкія рэцэпты, уражанні з паездак. Бывае нямала і смешных выпадкаў. Напрыклад, калі мы рыхтаваліся да Вялікадня, то пяклі кулічы. А здымаем праграмы звычайна напярэдадні свята. І вось раніцай мы прыйшлі ў студыю, замясілі цеста, трэба чакаць, пакуль яно падыдзе. Каб не губляць некалькі гадзін, Вартан дома загадзя прыгатаваў такое ж. Пачалі пячы з яго розныя варыянты святочных кулічоў. А замешанае цеста ў кут паставілі. Знялі адзін выпуск, узяліся за другі. Цеста ў гэты час расце. Мы яго крыху прыплюснем і далей займаемся сваёй справай. Вечарам, ужо завяршыўшы здымкі, разумеем, што з цестам трэба нешта рабіць. Вартан кажа: «Давайце, я зараз хуценька цеста ў духоўку пастаўлю і будзе нам пірог». А мы ўжо настолькі стаміліся, што ніякіх пачастункаў нікому не хацелася. Я прапанавала забраць цеста дадому. Захутала яго і павезла. Дома выклала на бляху. Праз паўгадзіны пайшоў пах па кватэры — аж на першым паверсе было чуваць. Аднекуль позна вяртаецца муж, я тлумачу яму сітуацыю. А назаўтра частавала яшчэ і сяброўак у лазні.

— А нейкія кулінарныя сакрэты для сябе падмячаеце?

— Безумоўна, вучуся многім новым рэчам, пачынаючы з дробязяў. Напрыклад, да праграмы я соль ці спецыі клала ў стравы лыжачкай, а Вартан усё бярэ рукой. І мяне вучыць пальцамі адчуваць неабходную норму. Аказваецца, так больш зручна, аднак трэба навучыцца гэтаму. Яшчэ ён распавёў, што я нішчыла добрыя спецыі. Я вельмі люблю прывозіць розныя спецыі з тых краін, дзе бываю. Вось, напрыклад, зіра — прыправа, якая нечым напамінае наш кмен. Раней я проста брала яе і дадавала ў страву. А трэба спачатку патрымаць яе на гарачай сухой патэльні секунд трыццаць, пакуль яна не пачне трэскацца, а потым яшчэ патаўчы яе крыху керамічнай ступкай, каб расціснуць, выпусціць пах. Важна дапамагаць стравам раскрыцца. Ці ж ведала я, што, дадаўшы ў бульбяное пюрэ крыху мускатнага арэху, можна смак яго зрабіць непаўторным.

— Ёсць, мабыць, месца здзіўленню і падчас пошуку ў вёсках гераінь для праграмы?

— У вёсках мы стараемся шукаць цікавых гаспадынь. Яны не артысткі прафесійныя, аднак важна, каб перад камерай адчувалі сябе свабодна. Уявіце, часам сустракаюцца бабулі, якія дзеляцца рэцэптамі сваіх прабабуль. Напрыклад, сёння, калі трэба нешта ўзбіць для прыгатавання стравы, то варта ўзяць міксер альбо блендэр — і праз некалькі секунд усё гатова. Што ж робіць бабуля ў вёсцы? Яна бярэ галінку ядлоўцу, высушаную і без іголак, і, трымаючы яе паміж далоняў, пачынае ўзбіваць тое яйка. Я, калі ўбачыла, то проста была ў захапленні. Многаму вучымся і многае дазнаёмся. Нават нейкія падрабязнасці з гісторыі таго ці іншага прадукту харчавання. Тыя ж спецыі сёння ў горадзе можна набыць любыя, а на вёсцы, як кажуць бабулі, «кроп усім запраўляе». Альбо смак нейкай стравы з шампіньёнамі не параўнаць з тым, калі дадасі лясныя грыбы, пасушаныя на печцы.

— Той факт, што ў праграме пра нацыянальную беларускую кухню гатуе повар з незвычайным імем — не выпадковасць?

— Па-першае, Вартан — лепшы повар з тых, каго я ведаю. Па-другое, ён не адзін год жыве ў Беларусі. Выдатна разбіраецца ў беларускай, турэцкай, італьянскай, французскай кухнях. Для повара нацыянальнасць не мае значэння. Проста так супала, што Вартан, як і мы, загарэўся ідэяй рабіць гэты праект. Акрамя таго, трэба ж яшчэ і ўмець вучыць гатаваць, што ўдаецца не кожнаму. Таму ўсё тлумачыцца толькі гэтым.

— Ад гаспадынь часта можна пачуць, што на смак стравы ўплывае настрой. Падзяляеце такі погляд?

16.00, 22.00 «Кветкі і песні Сан-Рэма ў Маскве». 1986 год.
17.00 «Двары нашага дзяцінства». 1992 год. 1-я частка.
17.55 «Гэта было, было... Гарадскі матыў». Канцэртная праграма. 1990 год.
18.15 «Паэт Генадзь Айгі чытае свае вершы». 2005 год. 1-я частка.
23.00 «Быў час». 2008 год.
23.55 «Агульная сцяна». Маст. фільм.
0.15 «Навіны поп-музыкі». 1989 год.
1.25 «Пад знакам задыяка. Стралец». 1993 год.
3.00 «Аднойчы ў снежні». Маст. фільм.
4.15 «Зіма — зіма». Фільм-канцэрт. 1984 год.

EUROSPORT

10.30, 14.15, 20.15, 1.50 Футбол. Бразілеманія.
10.45 Вось гэта дзіва!!!
11.45 Біятлон. Кубак свету.
12.45 Скачкі на лыжах. Кубак свету.
14.30, 19.30, 21.30, 2.05 Снукер. Чэмпіянат Брытаніі.
20.30 Вось гэта дзіва!!!
1.00 GTA. Наступны ўзровень.
1.20 Аўтаспорт. World Endurance Series.
1.45 Тэст-драйв.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20 Серыял «Доўга і шчаслі ва».
5.55, 8.40, 13.45, 16.45, 20.40, 21.50, 23.50, 3.05 «Камедыянты. Лепшае».
6.15 Камедыя «Норт».
9.00 Мюзікл «Дарога ў Рыа».
11.15 Камедыя «Сто мільёнаў еўра».
14.10 Камедыя «Высакародны венецыянец».
17.20 Камедыя «Мадам Ірма».
19.20 Камедыя «Замарожаны».
22.10 Маст. фільм «Я ніколі не буду тваёй».
0.10 Камедыя «Пацучыныя скачкі».
3.25 Камедыя «Помста пухнатых».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.15, 14.45 «Доктар І.».
8.45, 18.30, 2.45 «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
10.30, 17.00 «Паралельны свет». Дак. серыял.
11.30, 16.00 «Варажбітка». Дак. серыял.
12.30, 18.00 «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
13.00, 20.30 «М.У.Р». Серыял.
13.50, 2.00 «Дом дагары нагамі».
15.15, 0.15, 5.15 «Звышнатуральнае». Серыял.
21.30, 4.20 «Апошняя сустрэча». Серыял.
22.30 «Мой крывавы Валянцін». Маст. фільм.
1.00 «Быць чалавекам». Серыял.

ТБ1000

5.00 Камедыя «Добры хлопец».
6.40 Драма «Перарванае жыццё».
9.00 Драма «Канец рамана».
11.00 Меладрама «Брудныя танцы 2».
13.00 Камедыя «Каханне, якое збівае з ног».
14.45 Камедыя «Мноства».
17.00 Камедыя «З 13 у 30».
18.45 Меладрама «Прытварыся маім мужам».
20.35 Трагікамедыя «Пажыццёва».
22.30 Драма «Прах Анджэлы».
1.05 Камедыя «Без істэрыкі!».
2.55 Фільм жахаў «Страшылы».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.10 Мюзікл «Лятучая мыш».
8.00 Маст. фільм «Незвычайныя прыгоды Карыка і Валі».
11.00 Драма «У пачатку слаўных спраў».
13.40 Камедыя «Скарбы О.К.».
16.00 Меладрама «Выкрутасы».
18.00 Драма «Русалка».
20.00 Драма «Збавенне».
22.15 Драма «Злачынства і пакаранне».
0.30 Камедыя «Практыкаванні ў цудоўным».
2.15 Камедыя «Не хадзіце, дзеўкі, замуж».
4.00 Драма «Бедуін».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Гульня ў лічбы.
6.00, 16.00 На кручку: лоўля монстраў.
7.00 Даліна грызлі, або Поле бітвы — Елаўстоўн.
8.00, 13.00 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
9.00, 14.00 Расследаванні авіякатастроф.
10.00 Мегазаводы.
11.00 Дзясятка лепшых фота «Nat Geo» 3.
12.00 Шаша праз пекла.
15.00 Узыходжанне чорнага ваўка.
17.00, 2.00 Вайна генералаў.
18.00 Віні Джонс: Рэальна пра Расію.
19.00 Выпрабуйце свой мозг.
20.00, 0.00, 3.00 Гульні розуму.
21.00, 1.00, 4.00 Малпачалавек.
22.00 Картачны фокуснік.
23.00 Турэмныя цяжкасці.

DISCOVERY

7.00, 16.25 Залатая ліхаманка.
7.50 Адзін дзень з жыцця Бера Грылса.
8.40, 20.35 Як гэта ўстроена?
9.10, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35, 17.20, 23.00 Паляўнічыя на склады.
10.30, 0.00 Скрозь кратовую нару.
11.25, 3.55 Разбуральнікі легендаў.
12.20, 3.05 Асобае меню ад Беара Грылса.
13.15, 5.10 Хуткія і гучныя.
14.10, 6.05 Махінатары.
15.30 Зброя па-амерыканску.
18.15 Беар Грылс: выбрацца жывым.
19.10 Правілы пазадарожнага руху.
21.00 Дылеры.
22.00 Золата джунгляў.
0.55 Top Gear ЗША.
1.50 Мафія амішаў.
2.40 Маланкавыя катастрофы.

СУБОТА, 7 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.25** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.40, 23.05 Зона Х.
8.45 Слова Мітрапаліта Філарэта на Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы.
9.10, 17.35 Серыял «Сэрца Марыі».
10.05, 19.55 Серыял «Такое звычайнае жыццё».
11.00 Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
12.10 , 14.55, 18.35 Evrovision. Без каментараў.
12.15 Дзень у вялікім горадзе.
13.25 Нашы.
13.40 Дэтэктыў «Шулер».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 23.55 Серыял «Джамайка».
16.30 Зямельнае пытанне.
17.00 БеларусьLIFE.
19.20 Спецыяльны рэпартаж.
21.00 Панарама.
21.45 Меладрама «Страшная прыгажуня». 1-я серыя.
22.50 Актуальнае інтэрв'ю.
23.40 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.20 Тэлебарометр.
9.05, 17.55 Серыял «Двое з куфэрка».
10.15 Цудоўная сямёрка. Другі эпізод. Фігурнае катанне.
10.50 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
11.55 Цела чалавека.
12.30, 18.55 Баявік «Херувім».
14.20, 21.35 Серыял «Інтэрны».
15.30, 22.45 Серыял «Рэальныя хлопцы».
16.40 Беларуская часінка.
20.40 «Пад грыфам «Вядомыя».
21.25 Спортлато 5 з 36.
21.30 КЕНО.
23.55 Хакей. КХЛ. «Металург» (Новакузнецк) — «Дынама» (Мінск).

БЕЛАРУСЬ 3

7.30 «Дабраранак».
8.00, 12.20, 19.15, 0.25 «Калейдаскоп».
8.05, 12.30, 0.30 «Год у гісторыі».
8.20, 13.40, 19.10 «Размовы пра духоўнае».
8.25 «Кола». Маст. фільм.
8.50 «Карані».
9.20 «Найменні і вобразы». Народны майстар — каваль Зігмунд Сабко.
9.35, 22.35 «Раскол». Маст. фільм.
10.25, 22.10 «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
10.50 «Дэпутат Балтыкі». Маст. фільм.
12.45, 0.00 «Святло далёкай зоркі».
13.10, 23.30 «Аўтограф».
13.45 «Росчырк часу». Творчасць мастака-графіка Рыгора Клікушына.
14.00 «Цуды прыроды». Вялікабрытанія. Казахстан. Кітай. Чэхія.
14.30 «Скарбніца Гарадзеншчыны». Сведка Сярэднявечча. Гісторыя і архітэктура Мірскага замка.
15.00 «Росчырк часу». Віцебскі музей.
15.15 «Абочына». Маст. фільм.
16.45 «Палескі пачастунак». Парсючок.
17.00 «Канструктывізм». Дак. фільм.
17.25 «Маляваны рай». Дак. фільм.
17.45 «Свет прыроды». Блакітная жамчужына Палесся.
18.15 «Лабірынты». Ключ Літвы.
18.45 «Камертон». Яўген Еўтушэнка.
19.25 «Пышка». Маст. фільм.
20.30 Калыханка.
20.50 «Фруза». Маст. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

8.05 Гандбол. Чэмпіянат свету-2013. Беларусь — Сербія.
9.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крыстал Пэлас» — «Вест Хэм».
11.25 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету-2013.
13.55 Футбол. Ліга Еўропы. Агляд тура.
14.55 Хакей. КХЛ. «Металург» (Новакузнецк) — «Дынама» (Мінск).
17.20 Фактар сілы.
17.45 Баскетбол. Кубак выкліку. «Цмокі-Мінск» — «Сальнок» (Венгрыя).
19.20 Хакей. КХЛ. «Металург» (Новакузнецк) — «Дынама» (Мінск).
21.10 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Барселона» — «Дынама» (Мінск).
22.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Эвертон».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Закрытая школа».
12.10 «Яны і мы».
13.10 «Добрага здаровейка!».
13.55 «Модны прыгавор».
15.00 «Сам-насам з усімі».
16.15 «Зразумець. Дараваць».
16.55 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Наша Беларашка».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Адліга».
23.25 «Вячэрні Ургант».
0.05 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
9.00, 18.30 «Нам і не снілася»: «Рэліквія з абацтва».
10.05 «Аўтапанарама».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Ніна». Серыял.
12.30 «Джэймі ў сябе дома».
13.00 «Мінск і мінчане».
13.50 Камедыя «Укол парасонікам».
15.35 «Жывая тэма».
16.50 «Па законе».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Меладрама «Навальнічны перавал».
23.00 «Сакрэтныя тэрыторыі».
0.00 «Скардзіцца дазваляецца».
0.25 «Знахар». Серыял.

МІР

5.00 Серыял «Пяць хвілін да метро».
6.35 М/ф.
7.05 «Цік-так».
7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.15, 23.00 Маст. фільм «Бітва за Маскву».
10.45, 2.05 «Па-руску кажучы...».
11.10 «Агульны інтарэс».
11.35 «Беларусь сёння».
12.25, 2.30 Серыял «Клон».
14.10, 4.00 Дак. фільм «У свеце цудаў».
15.20, 22.05 Ток-шоу «Слова за слова».
16.20 Серыял «Танга з анёлам».
18.25 «Сакрэтныя матэрыялы».
19.00 Серыял «Паляванне на ізюбра».
21.25 «Акцэнты».
21.40 Дак. фільм «Рэальны свет».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.40 Серыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Іван ды Мар'я».
13.50, 16.50, 19.50, 0.35 Навіны — Беларусь.
14.30 «1000 дробязяў». Ток-шоу.
15.10 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.55 «Асаблівы выпадак».
17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».
18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».
18.55, 20.40 Серыял «Вастраў непатрэбных людзей».
21.45 Серыял «Руская спадчынніца».
22.45 Серыял «Шэрлак Холмс».
0.45 «Узыход Перамогі. Днепр: Крах Усходняга вала».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.55 «Да суда».
11.55 «Суд прысяжных».
13.25 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.25 «Справа ўрачоў».
15.15 «Справа густу».
15.40, 18.35 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
16.25 «Пракурорская праверка».
17.40 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.35 Серыял «Вышук».
23.05 Сёння. Вынікі.
23.30 Серыял «Нядзеля ў жаночай лазні».

8 КАНАЛ

7.00, 12.35, 19.10, 21.05, 23.40 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.20, 14.25 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
8.45 «Кінаблакнот».
9.00, 17.45 Серыял «Касл».
10.30 «Адшукваецца адпачынак».
11.00, 19.15 Серыял «Удар у адказ».
12.40 Баявік «Небяспечны Бангкок».
16.30 «Золата маўчання».
17.00 Серыял «Пякельныя коткі».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Фантастыка «Асобая думка».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00, 14.00, 18.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30, 17.30 «С.У.П.».
9.00, 20.00 Серыял «Двое бацькоў і двое сыноў».
10.00, 19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».
11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».
12.00, 21.10 Серыял «Маладзёжка».
13.00, 16.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.30, 17.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
14.30, 23.30 «Аўташкола».
15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».
16.00, 18.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.00 «Дарожныя войны».
0.30 «Ч.П?».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 14.40, 18.30, 22.30 Навіны культуры.
9.15 «Наглядальнік».
10.15, 0.55 «Пэры Мэйсан». Серыял.
11.05 Святы. «Уводзіны ў храм».
11.35, 17.40 Academia.
12.20 «Яўген Вучэціч. Эпоха ў камяні». Дак. фільм.
13.05, 21.40 «У крузе першым». Маст. фільм.
13.50 «Гіпакрат». Дак. фільм.
14.00 Улада факта.
14.50, 19.40 «Пошукі пазаземнага жыцця». Дак. фільм. Частка 1-я.
15.45 «Роздумы на Радзіме». Дак. фільм.
16.15 «Сусветныя скарбы культуры».
16.30 «Бязважкае жыццё». Дак. серыял.
17.00 «У вашым доме». Аляксей Масленікаў.
18.45 Галоўная роля.
19.00 «Абсалютны слых».
20.35 «Больш, чым каханне». Мая Булгакава.
21.15 Святы. «Уводзіны ў храм».
22.50 «Партыя ў шахматы». Маст. фільм.
0.40 К. Сен-Санс. «Муза і паэт».
1.45 «Гіпакрат». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Кліч джунгляў». 1994 год.
5.35 «З самага ранку». 1993 год.
6.10 «Трэцяя вяршыня Смятанінай». Дак. фільм.
6.40, 12.30, 18.30 «Месяц доўгіх дзён». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 20.00 «Час».
9.00, 15.00, 21.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 16.00 «Кветкі і песні Сан-Рэма ў Маскве» 1986 год.
11.00, 17.00 «Двары нашага дзяцінства». 1992 год.
11.55 «Гэта было, было... Гарадскі матыў». Канцэртная праграма. 1990 год.
12.15, 18.10 «Паэт Генадзь Айгі чытае свае вершы». 2005 год.
22.00 «Давайце знаёміцца, месяц май». Канцэрт. 1965 год.
23.00 «Вячэрнія мелодыі». Фільм-канцэрт. 1985 год.
1.00 «Вакол смеху». 1991 год.
2.00 «Напалам». Забаўляльная праграма. 1967 год.
3.30 «Што? Дзе? Калі?». 1988 год.

EUROSPORT

10.30 GTA. Наступны ўзровень.
10.45, 15.00, 19.30, 22.00, 2.45 Снукер. Чэмпіянат Брытаніі.
12.45, 1.00 Тэніс. Матс-пойнт.
13.15, 1.45 Вось гэта дзіва!!!
14.15, 20.15, 1.30 Футбол. Бразілеманія.
14.30 Аўтаспорт. World Endurance Series.
20.30, 21.50 Выбранае па серадах.
20.35 Конны спорт. Кубак свету.
21.35 Навіны коннага спорту.
21.40 Навіны гольфа.
21.45 Навіны паруснага спорту.
21.55 Спорт і Ко.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20 Серыял «Доўга і шчаслі ва».
5.55, 8.40, 13.45, 16.45, 20.40, 21.50, 23.50, 3.05 «Камедыянты. Лепшае».
6.15 Камедыя «Сто мільёнаў еўра».
9.00 Камедыя «Высакародны венецыянец».
11.15 Камедыя «Мадам Ірма».
14.10 Маст. фільм «Я ніколі не буду тваёй».
17.20 Камедыя «Замарожаны».
19.20 Камедыя «Іронія кахання».
21.30 Камедыя «Шалёны дзень інжынера Баркасава».
0.10 Мюзікл «Дарога ў Рыа».
3.25 Камедыя «Норт».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.15, 14.45 «Доктар І.».
8.45, 18.30, 2.50 «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
10.30, 17.00 «Паралельны свет». Дак. серыял.
11.30, 16.00 «Варажбітка». Дак. серыял.
12.30, 18.00 «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
13.00, 1.45 Вось гэта дзіва!!!
14.15, 20.15, 1.30 Футбол. Бразілеманія.
14.30 Аўтаспорт. World Endurance Series.
20.30, 21.50 Выбранае па серадах.
20.35 Конны спорт. Кубак свету.
21.35 Навіны коннага спорту.
21.40 Навіны гольфа.
21.45 Навіны паруснага спорту.
21.55 Спорт і Ко.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20 Серыял «Доўга і шчаслі ва».
5.55, 8.40, 13.45, 16.45, 20.40, 21.50, 23.50, 3.05 «Камедыянты. Лепшае».
6.15 Камедыя «Сто мільёнаў еўра».
9.00 Камедыя «Высакародны венецыянец».
11.15 Камедыя «Мадам Ірма».
14.10 Маст. фільм «Я ніколі не буду тваёй».
17.20 Камедыя «Замарожаны».
19.20 Камедыя «Іронія кахання».
21.30 Камедыя «Шалёны дзень інжынера Баркасава».
0.10 Мюзікл «Дарога ў Рыа».
3.25 Камедыя «Норт».

ТБ1000

5.00, 13.00 Камедыя «З 13 у 30».
6.45 Камедыя «Мноства».
9.00 Фэнтэзі «Уладар пярсцёнкаў: Брацтва пярсцёнка».
15.00 Меладрама «Прытварыся маім мужам».
16.50 Драма «Неўтаймоўныя сэрцы».
19.00 Камедыя «Ходзяць чуткі...».
21.00 Трылер «Праўда пра Чарлі».
23.00 Камедыя «Без істэрыкі!».
1.00 Трылер «Ідэальны незнаёмец».
3.00 Драма «Сёстры Магдаліны».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Драма «Русалка».
8.00 Меладрама «Выкрутасы».
10.00 Дэтэктыў «Сіняя барада».
11.50 Камедыя «Жаніцьба».
13.40 Драма «Збавенне».
16.00 Фільм-казка «Чароўны партрэт».
18.00 Камедыя «Ёлкі».
20.00 Камедыя «Трое дзяўчат».
22.00 Драма «Бедуін».
0.00 Драма «Арэлі».
2.00 Баявік «SLOVE. Прама ў сэрца».
4.00 Камедыя «Адам і ператварэнне Евы».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 21.00, 1.00, 4.00 Старацелі.
6.00, 16.00 На кручку: лоўля монстраў.
7.00 Паляванне на рачную пачвару.
8.00, 13.00 Гульні розуму.
9.00, 14.00 Малпачалавек.
10.00 Выпрабуйце свой мозг.
11.00, 23.00 Турэмныя цяжкасці.
12.00 Шаша праз пекла.
15.00 У пошуках гіганцкага кальмара.
17.00, 2.00 Зусім сакрэтна.
18.00, 20.00, 0.00, 3.00 Скарбашукальнікі.
22.00 Боскае ўмяшанне.

DISCOVERY

7.00, 16.25 Залатая ліхаманка.
7.50 Асобае меню ад Беара Грылса.
8.40, 20.35 Як гэта ўстроена?
9.10, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35, 17.20, 19.10 Паляўнічыя на склады.
10.30, 0.00 Скрозь кратовую нару.
11.25, 3.55 Разбуральнікі легендаў.
12.20, 3.05 Беар Грылс: як застацца ў жывых.
13.15, 5.10 Хуткія і гучныя.
14.10, 6.05 Махінатары.
15.30 Зброя па-амерыканску.
18.15 Золата джунгляў.
21.00 Пяцёрка лепшых.
22.00 Найбуйнейшы ў свеце карабель.
23.00 Як устроена Зямля.
0.55 Top Gear ЗША.
1.50 Мафія амішаў.
2.40 Маланкавыя катастрофы.

НЯДЗЕЛЯ, 8 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.35** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.40, 23.15 Зона Х.
9.10, 17.30 Серыял «Сэрца Марыі».
10.05, 19.55 Серыял «Такое звычайнае жыццё».
11.00 Дак. серыял «Містычныя гісторыі».

НА ПАМЯЦЬ — АД ДАРАГАНАЎ

У Асіповічах з'явяцца музейныя рэліквіі

У райцэнтр са Швецыі прыехалі асабістыя рэчы славутага роду Дараганаў.

Андрэй Дараган, праўнук Осіпа Дарагана, які жыў тут у XIX стагоддзі, прывёз са Стакгольма цэлы мікрааўтобус рэчаў, што некалі знаходзіліся ў маёнтку яго прапрадзеда на асіповіцкай зямлі. Гэта каля трохсот прадметаў побыту: посуд, дываны, дзіцячыя цацкі, пісьмовыя прыборы і шмат чаго іншага. Такое рашэнне патомак прыняў ужо даўно. Але спатрэбілася дапамога Міністэрства культуры Беларусі, пасольства Беларусі ў Эстоніі і іншых дыпламатычных службаў, каб здзейсніць задуманае. Андрэй Дараган неаднойчы быў на асіповіцкай зямлі, і яму імпануе, што тут ушанавалі памяць аб яго знакамітым продку. За 20 кіламетраў ад райцэнтра ёсць вёска Дараганава, дзе калісьці знаходзіліся летняя і зімовая рэзідэнцыі Дараганаў. Ад зімовай застаўся адзіны падмурак, але ў школьным музеі вёскі захоўваюцца рэчы гэтага роду. Іх, на жаль, няшмат. Таму патомак і вырашыў запоўніць гэты «прабел».

Як адзначыла дырэктар Асіповіцкага гісторыка-краязнаўчага музея Антаніна Сцяпанава, Андрэй Дараган сам будзе вырашаць, як размясціць усе гэтыя рэчы.

Род Дараганаў вядзе свой пачатак з XVI стагоддзя. Амаль усе яго мужчыны былі афіцэрамі расійскай арміі і флоту. Яны — героі Цусімы, Порт-Артура і Севастопаля. Шмат рэліквій гэтага роду захоўваецца ў Ваенна-марскім музеі Санкт-Пецярбурга. Іх перадаў туды яшчэ дзед Андрэя — Дзмітрый Дараган. Зараз Андрэй — захавальнік гістарычнай памяці свайго роду. Ён піша артыкулы, дапамагае музеям. З Асіповічамі ў яго даўнія і вельмі цёплыя зносіны. Антаніна Сцяпанава спадзяецца, што, магчыма, калісьці адновяць і былую рэзідэнцыю Дараганаў. «Гэты быў бы вельмі цікавы турыстычны маршрут, які аб'яднаў бы ўсе мясціны, звязаныя з прысутнасцю гэтага роду на нашай зямлі». Дарэчы, Дараганы з'яўляліся ўладальнікамі такіх населеных пунктаў, як Радуцічы, Крынкі, Жыцін. А ў вёсцы Дараганава ёсць магіла самога іх уладальніка — Драгана Осіпа. На жаль, зараз яна не ў самым лепшым стане...

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Вяртаючыся да надрукаванага

«ЧУМЫ НЯМА, БЫЛО ТОЛЬКІ ПАДАЗРЭННЕ НА ЯЕ...»

У нумары «Звязды» ад 23 лістапада пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» быў надрукаваны матэрыял «Дзік-сяголетак «падлажыў свінню»... Нагодай для яго напісання стаў зварот жыхаркі з вёскі Койры Пастаўскага раёна, якая паскардзілася, што жыхароў прымушаюць тэрмінова калоць свіней. Справа ў тым, што за колькі дзён да гэтага непадалёку ад вёскі была знойдзена туша дзіка-сяголетка. Узнікла падазрэнне, што ён загінуў ад афрыканскай чумы. Аднак, як цяпер высветлілася, гэта аказалася не больш чым падазрэннем. Пра што нам паведаміў галоўны ветэрынарны ўрач Пастаўскай райветстанцыі Генадзь Лютынскі, які сам патэлефанаваў у рэдакцыю раніцай у сераду.

Нагадаем, у мінулы раз мы прыводзілі словы начальніка Глыбоцкай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету (у сферу яе адказнасці ўваходзіць і Пастаўскі раён) Аляксея Протаса, які расказаў, што загінулы дзік быў сяголеткам — гэта значыць, гэтага года нараджэння. З чаго вынікала, што, калі ён хворы, хворым павінен быць і ўвесь статак. Калі б было нешта сур'ёзнае, былі б і іншыя тушы загінулай жывёлы. Аднак Аляксей Віктаравіч зазначыў, што больш ніхто нічога не знаходзіў...

У мінулую пятніцу цягам амаль цэлага дня мы спрабавалі пагутарыць з многімі, каб удакладніць інфармацыю: са старшынёй сельскага Савета, на тэрыторыі якога знаходзіцца вёска Койры, галоўным ветэрынарным урачом раёна, прадстаўніком лясгаса і раённай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Атрымалася гэта не адразу, паколькі, як высветлілася, менавіта ў пятніцу большую частку дня ў райвыканкаме праходзіла пасяджэнне з удзелам гэтых і іншых адказных работнікаў, прысвечанае якраз пытанню па афрыканскай чуме.

Бліжэй да вечара факт яе выяўлення пацвердзілі ў кароткай тэлефоннай размове галоўны ветэрынарны ўрач Пастаўскай райветстанцыі Генадзь Лютынскі і старшыня Шыркаўскага сельскага Савета Алена Рудніцкая, якая спаслалася на атрыманыя з абласной ветстанцыі дакументы аб выніках экспертызы дзіка-сяголетка. У папярэдні матэрыял не ўвайшлі словы старшыні раённай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Алега Карпіка, які ў самым канцы працоўнага дня сам пазваніў у рэдакцыю (перад гэтым ён не здымаў трубку) і таксама пацвердзіў: выяўлена афрыканская чума...

У цяперашняй тэлефоннай размове галоўны ветэрынарны ўрач Пастаўскай райветстанцыі Генадзь Лютынскі сказаў, што ніякай чумы няма, было толькі падазрэнне на яе. Так, напачатку былі атрыманы вынікі з абласной ветстанцыі, але цяпер прыйшлі звесткі з Мінска, паведаміў ён. Такім чынам, на шчасце, дыягназ не пацвердзіўся.

Паводле яго далейшых слоў, у раёне ёсць тры свінагадоўчыя комплексы. Трымаць на прыватных падворках свіней у 5-кіламетровай зоне вакол іх забаронена. «Па 20-кіламетровай зоне вядзём працу па адстрэле дзікоў», — сказаў Генадзь Лютынскі.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Прафілактыка раку

«ЗВЯЖЫЦЕ» КАНЦЭРАГЕНЫ КЛЯТЧАТКАЙ

Гэтымі днямі ва ўсіх анкалагічных установах краіны праходзіць рэспубліканская акцыя «Пераможам рак разам». Кожны ахвотны можа наведаць урачоў, каб атрымаць кансультацыю, прызначэнне на абследаванне і лячэнне.

Вучоныя звязваюць больш як 2/3 выпадкаў узнікнення раку з незбалансаваным харчаваннем, шкоднымі звычкамі, малой фізічнай актыўнасцю і іншымі асаблівасцямі стылю жыцця.

Акрамя празмернасці, у **харчаванні** могуць быць і іншыя небяспечныя для здароўя моманты.

- Гарачая ежа (прыводзіць да паўторных апёкаў слізістай абалонкі стрававода і страўніка).
- Ужыванне сухой, цвёрдай ежы (сухое мяса, сухі хлеб і інш.), дробнакоснай рыбы, асабліва ў спалучэнні з вострымі спецыямі (гэта траўмуе стрававод і страўнік, выклікае пашкоджанні, якія паступова могуць перайсці ў хранічнае запаленне).
- Нерэгулярнае ўжыванне ежы, недахоп у ёй вітамінаў, клятчаткі, дрэннае перажоўванне ежы, сухамятка.
- Частае ўжыванне смажаных прадуктаў (асабліва небяспечнае выкарыстанне для смажання той жа порцыі тлушчу).

Вітаміны і мікраэлементы вельмі карысныя, валодаюць супрацьпухліннымі вартасцямі. Напрыклад, бэта-каратін, які ёсць у хурме, слівах, абрыкосах, памідорах, моркве, кабачках, таксічны для клетак злаякасных пухлін. Ён змяняе бялкі, неабходныя для іх росту. Практычна такім жа дзеяннем валодаюць вітаміны А, С, Е, якія змяшчаюцца ў гародніне і фруктах, а таксама бурачным бацвінні, шпінаце, водарасцях, крапіве. Уся гародніна і фрукты — гэта яшчэ раслінныя валокны, клятчатка, якая звязвае і выводзіць з арганізма таксіны і канцэрагены рознага паходжання. Даказана, што прадукты з вялікай колькасцю раслінных валокнаў зніжаюць рызыку захворвання на рак кішэчніка.

Канцэрагеннае дзеянне спіртных напояў часткова залежыць ад раздражняльнага ўздзеяння на слізістую, развіццё ў ёй запалення. Акрамя таго, у спіртных напоях змяшчаюцца розныя дабаўкі і добра растваральныя ў спірце рэчывы, сярод якіх ёсць вядомыя канцэрагены. Этылавы спірт шкодны не толькі з пункту гледжання развіцця цырозу печані, але і спрыяе ўзнікненню раку печані, ротавай поласці, гартані, малочнай і шчытападобнай залоз, меланом.

Па сваёй канцэрагеннай сіле спіртныя напоі набліжаюцца да тытуню. Разам з тытунём іх можна назваць магутнай зброяй самагубства, асабліва калі ўлічыць, што іх дзеянне ўзмацняецца адно адным. Калі зусім нельга адмовіцца ад алкаголю, то доза павінна быць такой: чарка гарэлкі або келіх віна, або бутэлька піва ў дзень.

Існуюць звесткі і пра тое, што рэгулярныя фізічныя нагрузкі паніжаюць рызыку развіцця каларэктальнага раку, раку малочнай залозы, цела маткі, прастаты.

Нярэдка пухліны ўзнікаюць на фоне працяглых хранічных захворванняў, якія называюцца перадпухліннымі. Таму своечасова выяўляйце і лячыце іх.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Тэму падказаў чытач

ЦІ З'ЯВІЦЦА ПОМНІК НА МАГІЛЕ САВІЦКАГА?

Мінула тры гады, як не стала майстра мастацтва сучаснасці — Міхаіла Андрэевіча Савіцкага. Толькі, на жаль, і сёння на магіле Героя Беларусі няма помніка. Мінчане абураюцца, чытачы «Звязды» хвалююцца. «Гэта ж вялікі чалавек, выдатны творца, асоба... Як так можна?» — пішуць яны ў сваіх лістах у рэдакцыю, так гавораць і па тэлефоне... просяць разабрацца.

Згадваю, як пасля смерці мастака быў аб'яўлены конкурс на лепшае скульптурнае рашэнне гэтай задачы. Звяртаюся ў Міністэрства культуры. Мае пытанні іх не здзіўляюць: відаць, я ўжо не першая. Даведалася, што «справай» Савіцкага даручана займацца Рэспубліканскаму мастацка-экспертнаму савету па манументальным і манументальна-дэкаратыўным мастацтве. «Патрабаваць трэба з іх», — чую я напрыканцы.

Журналісцкія шляхі прывялі мяне да Івана Міско. Ён якраз і з'яўляецца намеснікам кіраўніка гэтага савета. Пра «справу» Міхаіла Андрэевіча ведае больш, чым хто.

— Конкурс на стварэнне помніка Савіцкаму на яго магіле ўжо завяршыўся, — памедаміў некаторыя недаказанасці Іван Яўхімавіч. — Было прадстаўлена больш за дзесяць праектаў. Лепшым прызналі эскіз вядомага скульптара Андрэя Заспіцкага. Даволі цікавы праект. Пасля ўнясення некаторых паправак мастак вылепіў скульптуру патрэбнага памеру. Неўзабаве яе ўжо адальюць у бронзе, і ў наступным годзе помнік Савіцкаму будзе ўсталяваны на яго магіле.

Скульптар Андрэй ЗАСПІЦКІ каля мініяцюры помніка.

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Толькі калі канкрэтна? Ці будзе гэта прымеркавана да пэўнай даты? І ці не зацягнецца гэтая справа ізноў? Яно ж так бывае: сёння пагаварылі, а заўтра пра ўсё забыліся.

Вырашылі, як кажуць, даведацца пра ўсё з першых вуснаў і накіраваліся ў майстэрню, дзе свае шэдэўры стварае заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Сустрэча з намі для Андрэя Заспіцкага была амаль нечаканасцю. Ён нават быў здзіўлены нашай увагай да яго асобы: прэсай майстар не распешчаны, пра сябе гаварыць не вельмі любіць. Таму даволі коратка расказваў пра Савіцкага і будучую скульптуру:

— Тое, што на конкурсе выбралі мой праект, мяне вельмі парадавала. Члены журы палічылі, што мая работа з'яўляецца больш выразнай у параўнанні з астатнімі, якраз той, якая падыходзіць для надмагілля. Магчыма, калі б выбіралі будучы помнік, сумняваюся, што спыніліся б на маім творы.

Праца над скульптурай Савіцкага ўжо скончана. Зараз гэты твор — на ліцейным заводзе, адліваецца ў бронзе. Андрэй Заспіцкі паказаў скульптуру ў мініяцюры (яна зроблена з пластыліну: такая асаблівасць працы майстра) і расказаў пра тую, якая будзе ўзвышацца над магілай Героя Беларусі, народнага мастака СССР:

— Я вылепіў Савіцкага такім, якім памятаю. Выразны твар, разумныя вочы, у якіх было відаць, што чалавек многае перажыў. Міхаіл Андрэевіч абапіраецца на п'едэстал. Яго фігуру мы бачым толькі да пояса. Галава апушчана: ён думае, што рабіў заўсёды і ўсюды. У руцэ мастак трымае пэндзаль. Вышыня скульптуры — 1 м 80 см. Сама скульптура будзе выканана ў бронзе, п'едэстал — з граніту.



Так будзе выглядаць помнік на магіле Міхаіла САВІЦКАГА.

Праца Андрэя Заспіцкага працягвалася каля месяца. Яму дапамагаў архітэктар Валерый Мітрафанаў, які зараз завяршае чарцяжы п'едэстала. Застанецца зрабіць толькі надпісы на ім. І, нарэшце, паставіць помнік на магіле. Толькі пытанне: калі гэта адбудзецца?

— Усталяваць помнік плануецца ў лютым, да дня нараджэння Міхаіла Савіцкага, — дзеліцца планамі скульптар і гаворыць пра тое, што яго звязвае з вялікім майстрам: — Мы нарадзіліся амаль у адзін дзень: ён 18 лютага, а я 16-га. Пераплецены і нашы імёны: адзін — Міхаіл Андрэевіч, другі — Андрэй Міхайлавіч.

...Цікавыя супадзенні, добрыя планы. Праўда, было б яшчэ лепш, калі б помнік гэтаму вялікаму чалавеку з'явіўся дзесьці па вясне, а не ў лютым, калі яшчэ ляжыць снег. Ды і прымеркаваць такую важную падзею было б добра да Дня Перамогі. Што вельмі дарэчы, калі ўзгадаць, што Савіцкі абараняў сваю радзіму на франтах Вялікай Айчыннай.

Вераніка КАНЮТА

«Не гладка» са стрэльбай выйшла

Супрацоўнікі міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету ў паляўнічых угоддзях каля вёскі Малеч спынілі двух жыхароў Бярозаўскага раёна. Стандартная праверка дакументаў выклікала збянтэжанасць і хваляванне. А потым адзін грамадзянін паспрабаваў збегчы ў лес...

— Праверыўшы зброю, дзяржінспектары высветлілі, што адзін з паляўнічых, з'яўляючыся ўладальнікам дзвюх зарэгістраваных стрэльбаў, перадаў адну з іх прыяцелю, якому некалі яна і належала. Справа ў тым, што ў студзені гэтага года мужчыну прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне аўтамабілем нападпітку і ён пазбавіўся права на нашэнне і захаванне паляўнічай зброі. І, паколькі стрэльба падлягала адчужэнню, перадаў яе ў валоданне сябру, — расказала **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч.** — Жаданне прыгадаць «мінулае» адыграла нядобры жарт з абодвума паляўнічымі: ім давядзецца адказваць за незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай гладкаствольнай зброі, а таксама за парушэнне правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Хто каго?

«Калі гу́лі ў галаве, сумна козам у хляве...»

Сам сябе не пахвалі, — ад іншых пакуль дачакаешся... А таму... «Заўсёды і з вялікім захапленнем углядаюся ў здымкі Анатоля Клешчука. На іх — наша Беларусь, яе людзі, яе прыгажосць. Некалі была папулярнай песня пра журналістаў, здольных «Трое суток не спать, трое суток шагать ради нескольких строчек в газете...». Дзеля некалькіх здымкаў — таксама! — сцвярджае спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў. — Не так даўно вось у «Звяздзе» быў рэпартаж з хутара Козлікі. А гэты здымак, мусіць, не змясціўся? Ці аўтар яго сумысля пакінуў?

Дзіўны хутар Козлікі
Нам адкрыў Кляшчук!
Фотаздымкаў — з воз які
Стуль прывёз у друк!
— Вось, — рашыў, — задачку
І на конкурс даў!
...Хай усе пабачаць —
Не на тых напаў!

І сапраўды ж — не на тых, бо подпіс нашы чытачы могуць прыдумаць да любога здымка! Не верыце? Тады чытайце.

Літаральна — парай слоў: «Не выходзьце за казлоў!».

«Быў час — людзі ці не біліся за ўчастак сенакосу, — узгадвае **спадар Сцяпан Нефідовіч з Лунінеччыны.** — У вёсцы Лахаўка было 187 кароў. Цяпер — толькі 13. Чаму? Людзі старэйшыя не маюць сілы, каб іх трымаць, а маладзейшым — далёка ездзіць на працу. Вось і атрымліваецца, што ў іх тую ж карову няма каму ні падаіць, ні выгнаць у поле... Ды і сена цяпер даражэннае. Прадаюць па 300 тысяч за рулон. На зіму трэба штук 10, сама меней. Значыць, 3 мільёны дастань і заплаці... Вось і пераходзяць людзі на коз».

Тое ж, але рыфмаваным радком паспрабавалі напісаць многія. У некага атрымалася горш, у некага — лепш... І з рознай доляй аптымізму.

Трымаць кароўку
Ужо нялоўка?
То выйсце прама:
Глядзі — рэкламу! —

усклікае **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў.** І тым самым нагадвае даўнюю размову. У аднаго тутэйшага дзядка неяк папыталіся:

— Вы кароўку яшчэ трымаеце?

— Не, — сказаў, — навошта яе трымаць? У поле выпусціў — ды хай ходзіць.

— То хаваеце?

— І хаваць не трэба — гэта ж не паўлітра.

— Значыць, маеце?

— Ну што вы?! У мяне ж баба ёсць.

Карацей, «не здаў» дзед інфармацыю... Хоць жыў (відавочна ж) так, як і ўсе. Гэта значыць...

Жонка была ў сіле,
Гаспадар здаровы —
Сена ўсім касілі:
Коніку, каровам...
Сёння на падворку
Дзве казы і коцік.
Ганак на падпорках
І сем дзір у плоце.

Гэта, гледзячы на здымак, з сумам канстатуе **спадарыня Любоў Чыгрынава з вёскі Забалацце Вілейскага раёна.** І нікто з ёй не спрачаецца, бо яно ж і сапраўды:

Час цяпер суровы,
Што і гаварыць:
Цяжка ўсё ж карову
Многім пракарміць.
Дык трымаюць козак,
(І не ў агародзе!)...
Браць з тых людцаў прыклад —
Я заўсёды згодзен! —

піша **спадар Іван Астроўскі з Мінска.**

А яшчэ такім рупліўцам добра было б дапамагаць — не працай, дык хоць рублём, бо іначай могуць прыдацца да здымка і радкі **спадарыні Гудачковай:**

Баба козак прадае:
На іх грошай нестае —
Цэны...
Пенсія ж така,
Што трымаць... Хіба ката?

(Узгадаўшы дзеда з яго кароўкай, можна пагадзіцца, што і ката лепш не трымаць — а тым больш за хвост... А вось хаваць, асабліва за пазухай, — райская асалода! Ды і карысць...)

Зрэшты, мы адхіліліся — ад тэмы, годны працяг якой у радках **спадара Нефідовіча:**

Спрадвеку сімвалам сяла
Кароўка добрая была.
Цяпер —
як брэнд у нашых сёл —
Каза...
А можа, дзе й казёл?

Ёсць прынцыповае пытанне, які ён (ну, той казёл...) — на чатырох нагах ці, можа, на дзвюх? **Спадарыня Ніна Бурко з вёскі Капланцы Бярэзінскага раёна,** ці не ўзгадаўшы казку, ведае, адкуль яны бяруцца:

Знайшоў Іване
пляшачку-заначку
І асушыць яе рашыў
тайком —
Каб жонка не з'явілася
знянацку,
Казу паставіў
ён вартаўніком.
Адолеў... А тут —
мама дарагая! —
Як гром той, жонка...
Нават з дзеркачом!
Яго з хаціны ў хлеўчык
выганяе...
А ты не пі —
не будуць зваць казлом!

Не пі, зразумела ж, прыхаванае, пляшкамі, тайком... А вось зрэдку ды чарыцу-другую — можа, і на карысць? Можа, і дапаможа... падвоіць гаспадарку? Па словах **спадарыні Гудачковай,** быў, быў такі выпадак!

Меў Піліп не драбязу, —
Прыгажунечку казу...
Калі чмыхне трохі дзе,
Лып-лып-лып, а козак дзве!

Якраз яны, падобна, у аб'ектыў і трапілі. А ўжо ж спадабаліся!

Козкі — быццам напаказ!..
А таму — кароткі сказ,
І напоюць малачком —
Свежым, цёпленькім
казіным.

Байка, можа, дарэчы?.. Званне самай карыснай жывёлы доўга мела свіння. Але ж неяк заўважыла яна, што да кароўкі, да казы людзі ставяцца лепш. Пайшла высвятляць, чаму гэта так? Кажа рагулькам (вялікай і малой): «Я разумею, вы прыгожыя, пяшчотныя, штодня даяце малачко... Але ж ад мяне карысці больш! Ну падумайце: маё мяса — у ежу, мая скура — на абутак, шчацінне — на шчоткі, нават імя — на абразы!» Канкурэнткі трохі падумалі і ўздыхнулі: «Можа, таму, што ўсё сваё ты аддаеш пасля смерці, а мы — пры жыцці?»

У праўдзівасці гэтых слоў цягам жыцця пераканаліся многія. І напісалі. «Некалі мае бацькі прадалі карову (не было дзе сена касіць), а купілі коз. Маці іх малако і на творог пускала, і каву бяліла, а смак усё роўна не той быў. Да таго ж козы пагрызлі ўсе бацькавы вуды. І дзеўкам маглі непрыемнасць зрабіць: ціхенька падкрасціся ззаду і давай сукенку жаваць... Так што мы з імі хутка развіталіся», — піша **спадарыня Гудачкова.**

«У нас таксама былі козы, — паведамляе **спадарыня Ірына Ермаковіч.** — Разумныя істоты! Што цікава — перад даеннем яны вельмі любілі ўзбірацца на ўслончык. А самае галоўнае — дакладна ведалі, калі трэба гэта рабіць!».

Адкуль, відаць, і радкі:
Я ўсё ж ведаю прычыну,
Што каза вось так стаіць:
Гаспадыня прывучыла,
Каб лягчэй было даіць, —

піша **спадар Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна.**

Прывучыць прывучыла, а вось потым... Потым, на думку **спадарыні Ермаковіч:**

Зноў адкладваецца дойка!
Загуляла, мусіць, Зойка?..
Як не стане гаспадыняй,
Хутка двор яе пакінем.
А калі наогул, то...
Дзівачка баба —
козак завяла,
Даі цяпер — штовечар
і шторанак.
А трэ было б завабліваць
«казла»,
Без малака?
Але б паправіў ганак!

Лічыць так **спадарыня Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны.** І гэтым самым не лішні раз сцвярджае, што ад пільных вачэй чытачоў нічога не схаваеш!

Глядзі хоць спераду,
хоць ззаду,
А коз —
хоць сёння на эстраду:
Гатовыя скакаць, бляяць...
Вось толькі б ног не паламаць, —

піша **пяцікласніца СШ №3 г. Вілейкі Ганна Тамашэвіч.**

Калі гулі ў галаве,
Сумна козам у хляве,
Хоць тут ганак і не новы,
Яны выступіць гатовы! —

дадае **сямікласніца той жа школы Кацярына Якутовіч.**

І нарэшце **дзевяцікласнік Віталь Піваварэвіч** ад імя «ганаровай варты» заяўляе:

Джэкі Чан, Джэймс Бонд,
Брус Лі?
Можаце адпачываць:
Досвед ваш перанялі —
Будзем самі вартаваць!

Што? Вядома **сужэнцам Астроўскім:**

Ёсць карысць ад козак,
Але ўсё ж народ
Кажа: «Не пускайце
Іх у агарод!».

...Ці заўважылі — наконт полу гэтых жывёлін аднадушна няма: большасць чытачоў сцвярджае, што гэта — козы, а вось меншасць...

Хай няблага свацця
Даглядае двор, —
Два казлы ў хаце —
Яўны перабор! —

заяўляе **спадар Гарачоў.** (З таго ж канверта:

Я пытаўся, і не раз:
«Дзе ж казёл начуе?»
Але чулася ў адказ:
«Ад казла і чую»)...

Менавіта гэтых істот убачыла на здымку і **спадарыня Тамара Маркушэўская з вёскі Петкавічы Баранавіцкага раёна:**

На прыём да галавы
Запісаліся казлы:
Сена — далі на кароўку,
А казлам? Грызі вяроўку?

Ад яе ж, ад **Тамары Сцяпанаўны,** самотнае:

Сельскі клуб...
Драўляны ганак,
Быў для моладзі прыстанак!
Ды... Прыйшло
ўсё ў заняпад:
Козы ёсць — няма дзяўчат.

Аднак заканчваць агляды на сумных нотах не ў традыцыях гэтай рубрыкі. А таму яшчэ некалькі цытат: «У мінулым конкурсным аглядзе, — піша **спадар Мікалай Валянцінавіч Старых з Гомеля,** — мяне назвалі Валянцінам Мікалаевічам. Але ж я не крыўдую. Мая былая супрацоўніца звярталася да мяне акурат таксама... Пакуль я не пачаў яе зваць Міхалінай Аленаўнай. Якраз гэта і новы подпіс да здымка навеяла:

На вуліцы Аранжавай
Жыве спадар няўважлівы.
Ён да дома надвячоркам
Дагары прыбіў «шасцёрку».
І аднойчы ў летні ранак
Пасвіць коз прыгнаў... на ганак.
Вось такі няўважлівы
З вуліцы Аранжавай.

З Гомеля ж, ад **спадарыні Раісы Васільевай,** яшчэ адна прыгожая замалёўка:

Во было для козак свята!
Як ускочылі ў хату!
Яны гойсалі, скакалі,
Ўсё пабілі, раскідалі,
Елі фікус і шпалеры,
А тады ужо —
За дзверы.
За бабуляй зараз сочаць:
Вось бы ў склеп
яшчэ ўскочыць!

То няхай, не будзем ім перашкаджаць. Тым больш што зараз самы час падвесці вынікі. На папярэднім здымку, нагадаем («Звязда» 12 кастрычніка), былі машына і мужчына, які спаў за сталом на ўзбочыне... Найлепшыя радкі пра іх, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, напісалі **спадары Старых з Гомеля, Гарачоў з Іўеўшчыны, Гаўрыш з Чавусаў, спадарыні Янец з Гродна і Чыгрынава з Вілейшчыны.** Вось з гэтым апошнім меркаваннем пагадзілася і журы маленькае, рэдакцыйнае. А таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету накіроўваецца ў вёску Забалацце Вілейскага раёна.

Вызначыла пераможцу і рэдакцыя «Вожыка». Ім стаў Валерый Гаўрыш. Гэта значыць, што менавіта да яго прыйдзе студзеньскі нумар часопіса.

Вы таксама хацелі б атрымліваць гэтыя беларускамоўныя выданні? Тады падпісвайцеся! Альбо ўважліва глядзіце на чарговы конкурсны здымак, прыдумвайце подпісы (кароткія, дасціпныя) і дасылайце на конкурс. Шанцы на выйгрыш ёсць у кожнага, нават... у аўтара здымка! Як лічыць спадар Гарачоў:

Калі здымак дадаецца,
Мы напішам зноў і зноў...
А Кляшчук дарма смяецца,
Бо адкажа за казлоў!

Валянціна ДОЎНАР

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Адзіночнае плаванне

ЗА ВАМІ СОЧЫЦЬ... БЕСПІЛОТНЫ КАТАР

На Цнянскім вадасховішчы прадэманстравалі доследны экзэмпляр першага ў СНД марскога беспілотнага катара. Гэта шасціметровае судна, пафарбаванае пад «камуфляж», можа выкарыстоўвацца для візуальнага і гідраакустычнага назірання, патрулявання, аховы гаваняў і асабліва важных аб'ектаў, у выратавальна-пошукавых работах, супрацьмінная і процілодачнай барацьбе і некаторых іншых важных справах.

— Дзякуючы гэтаму катару назіранні могуць весціся практычна без перапынку. Паколькі апарат беспілотны, не патрэбна непакоіцца пра экіпаж. Катар за гадзіну можа пераадолець 350 — 500 кіламетраў, што досыць значна для такога маленькага судна, — распавядае дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «КВАНД ІС» Сяргей Тыцык.

Гэтая беларуская кампанія распрацавала праграмнае забеспячэнне, стварыла сістэму аўтаматычнага кіравання і ўсталявала яе на катар. Дзякуючы гэтаму кіраваць ім можна, седзячы ў памяшканні. На спецыяльным маніторы магчыма бачыць усё, што фіксуе камера, усталяваная на катары, а таксама задаваць яму маршрут і адсочваць гэты шлях. Да таго ж камера і гучнагаварыцель на борце

дазваляюць весці перамовы з тымі, хто знаходзіцца на беразе ці на іншым судне.

Сам беспілотны апарат спраектавалі і збудавалі ў Санкт-Пецярбургу. Старшыня праўлення групы кампаній «Кампазітнае караблебудаванне» Сяргей Валошанка адзначыў, што падчас стварэння судна выкарыстоўваліся сучасныя тэхналогіі кампазітнага караблебудавання. Гэта значыць, што катар можа эксплуатавацца ў складаных кліматычных умовах, сама яго канструкцыя вельмі тэхналагічная, а працэс вытворчасці не патрабаваў вялікіх працоўных выдаткаў.

Беспілотнае судна збудавана пры падтрымцы Дзелавога клуба Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. У залежнасці ад мэты выкарыстання, на катары можа быць усталявана цеплавізійная камера, радар кругавога абзору, эхалот, метэастанцыя, аўтаматычны адказчык ці аварыйны радыёбуй. Выконваць любыя заданні беспілотнік можа, знаходзячыся на адлегласці да 360 кіламетраў ад берага на працягу 5 сутак з выкарыстаннем спутнікавага каналу сувязі.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■

ФАКТЫ

ДАСТУКАЦЦА ДА НЯБЁСАЎ

Моладзевая акцыя «Дастукацца да нябёсаў» пройдзе 1 снежня на цэнтральных плошчах усіх 23 гарадоў Мінскай вобласці. Прымеркавана мерапрыемства да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам.

Напрыклад, у Салігорску, Нясвіжы, Капылі, Барысаве, Жодзіне, Старых Дарогах, Клецку, Смалявічах запусцяць у неба белыя геліевыя шары — сімвал душ тых, хто стаў ахвярай хваробы. Такім чынам моладзь спрабуе дастукацца да нябёсаў — у надзеі, што яны дапамогуць у агульнай барацьбе з небяспечнай хваробай. Паўсюль пройдуць тэматычныя акцыі: «Запалі сваю свечку», «Чырвоная стужка», «Захавай сабе жыццё».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ДОМРАЧАВА — 6-Я. ДЛЯ РАЗГОНУ...

З затрымкай у адзін дзень (з-за дрэннага надвор'я) біятланісткі правялі першую індывідуальную гонку ў новым сезоне. У шведскім Эстэрсундзе перамогу святкавала чэшка Габрыэла Саўкалава. Дар'і Домрачавай узняцца на п'едэстал перашкодзілі чатыры промахі — па два на кожнай «стойцы». Беларуска фінішавала шостай. Больш трапнай аказалася Надзея Скардзіна, якая дапусціла два промахі і размясцілася на сёмым радку.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

НЕВЯДОМЫЯ ЗНІШЧЫЛІ КАЖАНОЎ

На тэрыторыі біялагічнага заказніка «Барбастэла» невядомыя знішчылі каля 60 асобін чырванакніжных кажаноў — еўрапейскіх шыракавушак.

Гэта выявілі спецыялісты Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў аховы навакольнага асяроддзя падчас правядзення маніторынгу захавання рэжыму аховы і выкарыстання біялагічнага заказніка мясцовага значэння. Ён быў створаны спецыяльна для захавання ўнікальнай, самай буйной у Беларусі зімоўкі рукакрылых. Кажаны ўкрываюцца на зіму ў старых фартыфікацыйных збудаваннях Брэсцкай крэпасці, якія размешчаны каля 10-й пагранічнай заставы. Зламыснікі ўзламалі браніраваныя дзверы і знішчылі каля 60 кажаноў, шмат траўміравалі. Былі таксама разбураны біятэхнічныя прыстасаванні ў месцах зімоўкі. Калі 25 лістапада спецыялісты Брэсцкага аблкамітэта праводзілі абследаванне тэрыторыі заказніка, усё было добра.

«АБМЫВАННЕ» ЗДЗЕЛКІ СКОНЧЫЛАСЯ ТРАГЕДЫЯЙ

На пажары ў вёсцы Манцюты Івацэвіцкага раёна загінуў мужчына, а яго брат атрымаў апёкі. Жанчына выратавалася... Мяркуецца, што нагодай для сустрэчы за накрытым сталом стаў продаж кватэры.

Пра пажар выратавальнікам стала вядома ўдзень. Калі падраздзяленні прыбылі на месца, дом ужо цалкам ахапіла полымя. Гаспадар 1950 года нараджэння здолеў самастойна пакінуць палаючае жыллё, нягледзячы на моцнае алкагольнае ап'яненне. Яго шпіталізавалі з тэрмічнымі апёкамі першай — трэцяй ступені галавы і спіны. Да прыбыцця падраздзяленняў МНС вяскоўцы выратавалі сужыцельку гаспадара дома. Жанчына 1962 года нараджэння не пацярпела. Пад канструкцыямі жылля пазней быў знойдзена цела стрыечнага брата гаспадара.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕЗ ДАКУМЕНТАЎ І ПАДАТКАЎ

У адным з гаражоў лідскія пагранічнікі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі выявілі склад кантрабанднага адзення, адкуль яно перапраўлялася на рынкі розных беларускіх гарадоў.

Удзельнікаў злачыннай схемы затрымалі ўначы падчас адгрузкі чарговай партыі «левага» тавару. Увогуле ў гаражы мясцовага жыхара захоўвалася 326 адзінак трыкатажных вырабаў на суму каля 104 мільёнаў рублёў. Жаночае адзенне трапляла ў нашу краіну дробнымі партыямі з Літвы — без дакументаў і, зразумела, разліку па падатках. Аператыўнікам удалося адсачыць увесь ланцужок дастаўкі і распаўсюджвання нелегальнага тавару.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПРАЗ ЧАТЫРЫ ГАДЫ КАНЯ ВЯРНУЛІ

Пенсіянеры з вёскі Ямное Рагачоўскага раёна атрымалі нечаканы падарунак да «залатога» вяселля ад супрацоўнікаў міліцыі. Каня, які быў выкрадзены чатыры гады таму, знайшлі якраз перад юбілеем.

У чэрвені 2009 года Яўген Марчанка прывязаў свайго Красаўчыка каля хаты, а раніцай жывёлы ўжо не было на месцы. Мужчына вельмі перажываў, бо маладога жарабца асабіста вывучыў нялёгкай вясковай працы. Пасля гэтага здарэння ў гаспадара нават адказалі ногі. Усе гэтыя гады супрацоўнікі мясцовай міліцыі запрашалі пенсіянера на апазнаванне розных коней — але ж роднай жывёліны сярод іх не было. Да чарговай прапановы Яўгеній Дарафеевіч аднёсся скептычна, але ж на гэты раз цуд адбыўся. Жарабец радасна заржаў, калі пабачыў гаспадара. А ў 73-гадовага мужчыны слёзы на вочы навярнуліся ад такой нечаканасці. Як расказаў намеснік начальніка ўпраўлення крымінальнага вышуку УУС Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Падабед, крадзеж здзейсніў раней асуджаны жыхар Жлобінскага раёна. Практычна адразу ж абмяняў каня на іншага, а памагаты злодзея перапрадаў жывёлу зноў жа ў Рагачоўскі раён, але ў вёску па іншы бок Дняпра. Такая шматхадовая камбінацыя і заблытала на некаторы час аператыўнікаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НАВІНЫ

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«НЕ ВЫЗВАЛІЛІ АД ПАДАТКАЎ, БО СУМЕСНА З ДЗЕЦЬМІ ПРАЖЫВАЕ ПРАЦАЗДОЛЬНАЯ ЦЁТКА»

З адной з вёсак Клецкага раёна патэлефанавала заяўніца са скаргай наконт падаткаабкладання. «Гаворка ідзе пра дзяцей-сірот. Яны не працуюць, а вучацца. Аднаму 19 гадоў, другому — 16. Адкуль у іх грошы? А тут з сельскага Савета прыспешваюць, каб аплачвалі падатак на зямлю і нерухомасць да пэўнай даты, бо потым будзе налічвацца яшчэ і пеня. Дом дзецям дастаўся ў спадчыну». Як высветлілася, заяўніца даводзілася дзецям цёткай. Яна была прапісана і пражывала ў тым жа доме, што і пляменнікі.

Калі мы патэлефанавалі ў інспекцыю Міністэрства па падатках і зборах па Клецкім раёне, высветлілася, што заяўніца ўжо звярталася да іх і сітуацыю ёй патлумачылі. Тым не менш жанчына чамусьці вырашыла звярнуцца па тым жа пытанні і ў газету...

— Згодна з законам 19-гадовы чалавек павінен плаціць падаткі, права на льготу ён не мае пасля дасягнення паўналецця, — распавёў нам намеснік начальніка аддзела кантролю за падаткаабкладаннем індывідуальных прадпрымальнікаў і фізічных асоб інспекцыі Міраслаў Байрашэўскі. — Разам з тым, улічваючы матэрыяльнае становішча, сельскі Савет мае права вызваліць гэтага маладога чалавека ад выплаты падаткаў. Так, дзецям у спадчыну дасталася палова дома. Але справа ў тым, што разам з імі прапісана і пражывае іх цётка — чалавек працаздольнага ўзросту, які, між тым, нідзе не працуе. Выходзячы з гэтага, сельскі Савет палічыў неабавязковым вызваляць грамадзяніна ад выплаты падаткаў. Тым не менш зямельны падатак за гэты год у суме 24 тысячы ўжо ўнесены. На нерухомасць ён складае 70 тысяч. Калі ваша заяўніца была на прыёме ў начальніка інспекцыі, сказала, што будзе выплачаны і гэты падатак.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НОВЫЯ АБЛІГАЦЫІ ПАД 7% ГАДАВЫХ

Найбуйнейшы банк краіны распачаў рэалізацыю двух выпускаў уласных валютных аблігацый для насельніцтва, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.

Тэрмін абароту аблігацый складае паўтара года, а стаўка даходнасці — 7% гадавых. Каштоўныя паперы прапануюцца фізічным асобам па намінальным кошце 1 тысяча і 5 тысяч долараў. Аб'ём эмісій абодвух выпускаў новых аблігацый складае 70 млн долараў.

Даход выплачваецца адзін раз у паўгоддзе. Адным з плюсоў гэтых аблігацый з'яўляецца магчымасць прад'яўлення да датэрміновага пагашэння праз 6 месяцаў пасля іх набыцця. Для набыцця і гашэння аблігацый наяўнасць пашпарта кліенту не патрэбна, бо гэта каштоўныя паперы на прад'яўніка.

Сяргей КУРКАЧ.

ПРОДАЕТСЯ СКЛАДСКОЙ КОМПЛЕКС
с офисными помещениями
11 000 м²
г. Бобруйск, ул. Рабочая, 23
Рассрочка.
Тел. 8(029) 195 56 81.
УНП 100080849

Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:
- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1188483, 1200609, 0950510-0950516, 0950518-0950519, 0950524, 0950526, 0950528, 0950531, 0950533, 0980430-0980431, 0980433-0980436, 0980438-0980439, 1034170-1034189, 1106596, 1106619-1106626, 0911920, 0911923-0911927, 0911929, 0911931-0911932, 0962915, 0976199, 0976567, 0979613, 0993678, 1001008, 1001068, 1008543, 1008596, 1028557, 1028723, 1039180, 1039332, 1047747, 1050792, 1050893, 1053002, 1053004, 1053167, 1053179, 1065485, 1065596, 1077227, 1083289, 1087550, 1095970, 1096184, 1129711, 1145265, 1145285, 1148133, 1148223, 1162546, 1164557, 1164600, 1164895, 1170245, 1170247, 1172501, 1182136, 1188739;
- квитанции 1 СУ серия КС №№ 0909975, 0922059, 3479615, 0922028, 3476821;
- страховой полис комбинированный «Добровольное страхование строений и домашнего имущества граждан; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир» (форма 2РН) серия БИ №№ 0000551, 0000473;
- добровольное страхование от несчастных случаев (форма 2РН, 2РП) серия БИ №№ 0011304, 0014241, 0020239.
УНП 100782388

ОАО «Белпромтара»
уведомляет о проведении внеочередного общего собрания акционеров
17 декабря 2013 года в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 22.

Повестка дня:
1. О наблюдательном совете.
УНП 100230455

Уважаемые акционеры ОАО «Белхим»

13 декабря 2013 года
состоится внеочередное общее собрание акционеров
ОАО «Белхим»,
расположенного по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34.
Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34 (зал заседаний).

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:
1. О наблюдательном совете ОАО «Белхим».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Короля, д. 34 с 05 декабря по 12 декабря 2013 года (время работы с 9.00 до 16.30).**

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 11 декабря 2013 года.

Регистрация участников собрания 13 декабря 2013 года с 14.00 до 15.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 13 декабря 2013 года в 15.00.

Для регистрации при себе иметь документы, удостоверяющие личность (паспорт).
УНП 100122846

Администрация Фрунзенского района г. Минска
ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ
в общественном обсуждении архитектурно-планировочной концепции объекта строительства «Многоквартирный жилой дом в квартале ул. Бурдейного – Тимошенко — Одинцова — Якубовского»

Обсуждение будет проводиться в период с 10.12.2013 г. по 24.12.2013 г. путем размещения экспозиции по адресу: г. Минск, ул. Бурдейного, 13, в помещении УП ЖЭС № 81 УП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска» с 9.00 до 19.00.

Встреча комиссии с населением состоится 26.12.2013 в помещении УО «СШ № 151 г. Минска» по ул. Одинцова, 12 (начало в 19.00).

Представитель организатора — управление архитектуры и строительства администрации Фрунзенского района г. Минска, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 39, т. 2044167.
УНП 191239047

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями общественного назначения по генплану №№ 12, 13,14, 20 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко». 2-я, 3-я и 4-я очереди строительства. Жилые дома №№ 12, 13, 14 по генплану

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «БелБизнесРесурс», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 15 декабря 2006 г. № 2548 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190782901.

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220113, г. Минск, ул. Белинского, дом 4, ком. 1.

Почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, д. 21А.

Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (017) 388 54 64, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ООО «БелБизнесРесурс» строительство не осуществляло.

Информация о проекте строительства.

Цель строительства – исполнение условий договора № 409-Д от 03 декабря 2012 года, заключенного с Минским городским исполнительным комитетом на реализацию права проектирования и строительства группы многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения по г/п №№ 12, 13, 14, 20 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко, которые не относятся к категории повышенной комфортности.

Строительство ведется с выделением очередей:
- жилой дом по ГП № 20 – 1-я очередь строительства;
- жилой дом по ГП № 12 – 2-я очередь строительства;
- жилой дом по ГП № 13 – 3-я очередь строительства;
- жилой дом по ГП № 14 – 4-я очередь строительства.

Начало строительства 2 очереди – ноябрь 2013 года, окончание строительства 2 очереди – март 2015 года.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы (РУП «Главгосстройэкспертиза») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 556-60/13 от 05.09.2013 г.;

- решение Минского городского исполнительного комитета № 1983 от 08 августа 2013 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решение Мингорисполкома»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/726-11646 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000005006576, расположенный по адресу: г. Минск, в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко, площадью 0,16 га для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома № 12 по генплану;

- свидетельство (удостоверение) № №500/726-11647 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000005006577, расположенный по адресу: г. Минск, в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко, площадью 1,8097 га для строительства и обслуживания объекта «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями общественного назначения по генплану №№ 12, 13, 14, 20 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко» 2-я, 3-я, 4-я очереди строительства. Жилые дома №№ 12, 13, 14 по г/п.;

- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-044/13 от 13.11.2013 г.

Генеральный подрядчик ООО «ДомСтройАгент». Договор строительного подряда №-25-09-2013/С-12 от 25.09.2013 г.

Жилой дом по ГП № 12 – одноподъездный 143-квартирный 19-20-этажный жилой дом запроектирован в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко. На первом и цокольном этажах размещаются помещения торгово-общественного назначения. В здании имеются помещения технического подполья и теплый технический чердак. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона. Наружная отделка фасадов – штукатурка по сетке с последующей окраской фасадной краской, облицовка плиткой из вибропрессованного бетона (цоколь, подпорные стенки и приямки). Оконные блоки стеклопакеты ПВХ, лоджии и балконы остеклены. Планировки квартир выполнены с учетом принципов функционального зонирования, внутренняя отделка квартир – подготовка под финишную отделку. Здание оборудовано инженерными системами, необходимыми для функционирования жилого дома, мусоропроводом, двумя лифтами. Предусмотрено выполнение мероприятий по организации безбарьерной среды для физически ослабленных лиц и маломобильных групп населения.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в общую долевую собственность, входят:

помещения инженерного назначения (электрощитовые, машинные отделения, мусоросборники, тепловые пункты, лифтовые шахты, водомерный узел); коридоры (за исключением коридоров, составляющих вспомогательные площади по отношению к встроенным, встроенно-пристроенным помещениям, КПУТ, ПНС, помещения венткамер), лифты и лифтовые холлы, вестибюли, межэтажные лестницы и переходные балконы, тамбуры, конструкции дома, водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, гостевые парковки, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Вся территория благоустраивается и озеленятся за счет организации подъездов, проездов и автостоянок, формирования сети пешеходных тротуаров, дорожек и аллей, площадок, устройства подпорных стенок и наружных лестниц, создания декоративно-ландшафтных композиций, расстановки малых архитектурных форм. Благоустройство внутридворовой территории включает устройство детских площадок, площадок для отдыха взрослого населения.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц однокомнатные, двухкомнатные, трехкомнатные, четырех- и пятикомнатные в жилом доме по ГП № 12:

1- комнатные квартиры – при 100% оплате стоимости стоимость **1 м² 1350 долларов США,** при оплате в рассрочку стоимость **1 м² 1400 долларов США;**

2-, 3-, 4-, 5-комнатные – при 100% оплате стоимости стоимость **1 м² 1250 долларов США,** при оплате в рассрочку стоимость **1 м² 1300 долларов США**;

встроенные помещения торгово-общественного назначения на 1 и цокольном этажах жилого дома общей площадью от 47 до 103 м²:

на 1 этаже жилого дома – при 100% оплате стоимость 1 м² **1900** долларов США, при оплате в рассрочку стоимость 1 м² **2100** долларов США;

в цокольном этаже жилого дома – при 100% оплате стоимость 1 м² **1800** долларов США, при оплате в рассрочку стоимость 1 м² **1900** долларов США.

Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир и встроенных помещений торгово-общественного назначения, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ООО «БелБизнесРесурс» по адресу: г. Минск, переулок Червякова, д. 21А, каб. 12. Уполномоченный представитель по вопросам долевого строительства ОДО «Айрон», действует на основании договора об оказании инженерных услуг от 08.09.2010 №-127/У. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (017) 388 54 64, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.**

Официальный сайт www.airon.by

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Многоквартирный жилой дом по генплану № 3 со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения по пр. Победителей в границах жилого района Лебяжий»

Застройщик: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республики Беларусь, 220053, г. Минск, пер. Червякова, д. 21А, пом. 3, каб. 4, 6. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.**

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ОДО «Айрон», как заказчиком строительства были построены следующие объекты:

в 2010 году

жилой дом № 11 по ул. Связистов в г. Минске

в 2011 году:

жилой дом № 37А по ул. Бумажкова в г. Минске, жилой дом № 10 по ул. Нововиленская в г. Минске;

в 2012 году:

жилой дом № 31А по ул. Карвата в г. Минске;

в 2013 году:

жилой дом № 44 по ул. Янковского в г. Минске;

Информация о проекте строительства.

Цель строительства – строительство объекта «Многоквартирный жилой дом по генплану № 3 со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения по пр.Победителей в границах жилого района Лебяжий».

Начало строительства – апрель 2013 года, окончание строительства – ноябрь 2016 года.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы (РУП «Госстройэкспертиза») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 1304-15/12 от 11.02.2013 г.;

- решение Минского городского исполнительного комитета № 459 от 28.02.2013 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении дополнения в решение Мингорисполкома»;

- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права временного пользования сроком до 01 января 2017 года №-500/147-8043, 500/726-11363, 500/726-11364 в отношении земельных участков с кадастровыми номерами 500000000007006468, 500000000007006469, 500000000007006532 площадью 0,5014 га, 1.1576 га, 0,0868 га, соответственно, и расположенных по адресу: г. Минск, пр-т Победителей в границах жилого района Лебяжий;

- разрешения на производство строительно-монтажных работ Инспекции Департамента по надзору и контроля за строительством по г. Минску от №- 2-209Ж-002/13 от 19.04.2013 г.

Генеральный подрядчик ООО «ДомСтройАгент». Договор генерального строительного подряда от 17 апреля 2013 №-17-04-2013/ПЗ.

Объект «Многоквартирный жилой дом по генплану № 3 со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения по пр.Победителей в границах жилого района Лебяжий» расположен вдоль проспекта Победителей в увязке с планировкой жилого района «Лебяжий». Дом состоит из 2-уровнего подземного гаража стоянки, встроенных помещений и жилой части. На уровне 2-го этажа проходит пешеходная платформа (стилобат), которая является объединяющим архитектурным элементом всей линии застройки. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона. Наружная отделка – декоративная рельефная штукатурка с покраской фасадными красками, облицовка плиткой из вибропрессованного бетона. Оконные блоки – стеклопакеты ПВХ.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в общую долевую собственность, входят помещения инженерного назначения (электрощитовые, машинные отделения, мусоросборники, тепловые пункты, лифтовые шахты, водомерный узел); коридоры (за исключением коридоров, составляющих вспомогательные площади по отношению к встроенным, встроенно-пристроенным помещениям), лифты и лифтовые холлы, вестибюли, межэтажные лестницы и переходные балконы, тамбуры, конструкции дома, водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, гостевые парковки, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Стоимость строительства помещений, не входящих в состав общего имущества комплекса: встроенно-пристроенная часть объекта строительства, встроенно-пристроенные нежилые помещения общественного назначения, расположенные в подвале и на первом этаже жилой части объекта строительства и объекты, которые служат для использования этих помещений (коридоры, тамбуры, санузлы и подсобные помещения, в т.ч. помещения КПУТ, венткамеры, ПНС), не включаются в стоимость 1 кв.метра стоимости жилого дома и не передаются дольщикам в качестве имущества совместного домовладения.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагается для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц, индивидуальных предпринимателей машино-места в двухуровневой подземной гараж-стоянке стоимостью 17 000 долларов США.

Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей.

Ознакомление дольщиков с информацией об объектах долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ОДО «Айрон» по адресу: г. Минск, пер.Червякова, д. 21А, каб. 12. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (017) 388 54 64, 8 (029) 708 46 64.**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Строительство двух 19-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий»

Застройщик: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, пер. Червякова, д. 21А, помещение 3, каб. 4,6. **Тел. 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (017) 388 54 64, 8 (029) 708 46 64.**

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ОДО «Айрон», как заказчиком строительства были построены следующие объекты:

в 2010 году:

жилой дом № 11 по ул. Связистов в г. Минске,

в 2011 году:

жилой дом № 37А по ул. Бумажкова в г. Минске, жилой дом № 10 по ул. Нововиленская в г. Минске;

в 2012 году:

жилой дом № 31А по ул. Карвата в г. Минске;

в 2013 году:

жилой дом № 44 по ул. Янковского в г. Минске.

Информация о проекте строительства.

Цель строительства – исполнение условий договора № 89-Д от 23 февраля 2012 года, заключенного с Минским городским исполнительным комитетом на реализацию права проектирования и строительства двух 19-этажных многоквартирных домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале ул. Ржавецкой – ул. Проектируемая № 1 – ул. Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий.

Начало строительства – 3 квартал 2013 года, окончание строительства – 4 квартал 2014 года.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы (РУП «Госстройэкспертиза») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 503-60\12 от 21.08.2012 г.;

- решение Минского городского исполнительного комитета № 2426 от 03 августа 2012 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/726-9995 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000007006166, расположенный по адресу: г. Минск, квартал улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий, площадью 0,9303 га для строительства объекта «Строительство двух 19-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая №1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий»;

- разрешение на производство строительно-монтажных работ Инспекции Департамента по надзору и контролю за строительством по г. Минску № 2-209Ж-050/12 от 27.12.2012 г.

Генеральный подрядчик ООО «ДомСтройАгент». Договор строительного подряда №-60-10-2012-Л от 19.10.2012 г.

Проектом предусматривается размещение на площадке в квартале улиц Ржавецкая – Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 двух 20-этажных 144-квартирных жилых домов № 1 и № 2 по генплану, открытых автомобильных парковок общей вместимостью 149 машино-мест с местами для машин маломобильных групп населения, двух детских площадок, двух площадок для отдыха. Проектом предусмотрено строительство объекта в 2 этапа: 1 этап: жилой дом № 2 по генплану и наружные инженерные сети к нему; 2 этап: жилой дом № 1 по генплану и наружные инженерные сети к нему. В подвале и на 1 этаже расположены встроенные помещения общественного назначения, помещение кондоминимума.

Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона. Наружная отделка – декоративная рельефная штукатурка с покраской фасадными красками, облицовка плиткой из вибропрессованного бетона. Оконные блоки – стеклопакеты ПВХ, лоджии и балконы остеклены. Планировки квартир выполнены с учетом принципов функционального зонирования, внутренняя отделка квартир – подготовка под финишную отделку. Секция оборудована двумя лифтами, мусоропроводом.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в общую долевую собственность, входят помещения инженерного назначения (электрощитовые, машинные отделения, мусоросборники, тепловые пункты, лифтовые шахты, водомерный узел); коридоры (за исключением коридоров, составляющих вспомогательные площади по отношению к встроенным, встроенно-пристроенным помещениям, КПУТ, ПНС, венткамер), лифты и лифтовые холлы, вестибюли, межэтажные лестницы и переходные балконы, тамбуры, конструкции дома, водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, гостевые парковки, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц однокомнатные, двухкомнатные, трехкомнатные, четырехкомнатные и пятикомнатные квартиры, встроенные помещения торгово-общественного назначения в жилом доме № 1 по генплану:

1-комнатные квартиры – при 100% оплате стоимость 1 м² **1350** долларов США, при оплате в рассрочку стоимость 1 м² **1400** долларов США;

2-, 3-, 4-, 5-комнатные квартиры – при 100% оплате стоимость 1 м² **1250** долларов США, при оплате в рассрочку стоимость 1 м² **1300** долларов США;

встроенные помещения торгово-общественного назначения на 1 этаже жилого дома площадью от 53 до 89 м² – при 100% оплате стоимость 1 м² **1800** долларов США, при оплате в рассрочку стоимость 1 м² **1990** долларов США;

встроенные помещения торгово-общественного назначения в цокольном этаже жилого дома площадью от 47 до 103 м² – при 100% оплате стоимость 1 м² **1800** долларов США, при оплате в рассрочку стоимость 1 м² **1900** долларов США.

Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, встроенных помещений торгово-общественного назначения, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ОДО «Айрон» по адресу г. Минск, переулок Червякова, д. 21А, каб. 12. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (017) 388 54 64, 8 (029)708 46 64.**

Официальный сайт www.airon.by

БОЛЬШ ЧЫМ ЧАЙ

Раней я, як і большасць маіх знаёмых, запівала чаем бутэрброды ды торцікі. Але пасля таго, як трапіла на гунфу-ча (так па-кітайску называецца чайная цырымонія, дзе апошні склад перакладаецца, як «чай», а першыя два — «вышэйшае мастацтва»), змяніла сваё стаўленне да напою, які ў Кітаі вынайшлі (толькі задумайцеся!) больш за 4 тысячы гадоў таму…

«Пры знаёмстве з пуэрам галоўнае… адкрытасць»

Уладкоўваемся з сябрамі на маленькіх расшытых падушках, раскіданых па падлозе, і выбіраем чай, які будзем піць. Гаспадыня «Чайнай студыі», якая нядаўна вярнулася з Кітая, рэкамендуе шэн пуэр. Чаму менавіта яго, даведаемся крыху пазней. А пакуль… знаёмімся… «Таня, гэта чай. Чай, гэта Таня»,— вымаўляе сяброўка (яна ўжо была на падобнай цырымоніі), і пры гэтым падносіць адмысловую ёмістасць з пуэрам да твару. Павольна ўдыхае водар… «А з чаем заўсёды ўслых трэба знаёміцца?» — цікавімся мы.— «Не, не абавязкова,— усміхаецца Алёна.— Пры знаёмстве з чаем, як і з чалавекам, галоўнае — адкрытасць».

Пакуль сябры па чарзе «знаёміліся» з пуэрам, я заварожана назірала за чайным столікам, на якім кожны прадмет, быццам фігура на шахматнай дошцы, дакладна ведае сваё месца, за кропелькамі вады на сценках мініяцюрнага парцэлянавага чайніка, за мяккім святлом ад свечак…

Цырымонія працягваецца… Алёна Вялічка плаўнымі рухамі разлівае духмяны напой у вытанчаныя піялы. «Ну што, заўважылі, як з кожным новым кубачкам мяняецца смак? — падмігвае гаспадыня «Чайнай студыі».— Гэта чай так сябе праяўляе, раскрываецца…»

І чым больш ён раскрываўся, тым больш пытанняў узнікала ў нас да Алёны.

— Скажыце, а ці праўда, што чай спрыяе пахуданню?

— Які *(усміхаецца)*? Я стараюся пазбягаць любога абагульнення пра чай. Кітайскія спецыялісты лічаць, што лепш за ўсё паляпшаюць абмен рэчываў улуны і пуэры. Але лішняя вага, самі разумееце, можа быць звязана не толькі з абменнымі працэсамі ў арганізме. Таму я б не ставілася да чаю выключна як да лекаў. Чаяванне — гэта адзін са шматлікіх спосабаў дасягнення ўнутранай гармоніі. А менавіта ў гармоніі чалавеку лягчэй адрэгуляваць нейкія працэсы ў сваім арганізме, знайсці шлях да сябе…

— Вы сапраўды лічыце, што чай можа дапамагчы нешта зразумець пра сябе?

— Вядома, няма нічога ўніверсальнага. Ёсць спосабы, якія падыходзяць для адных, але не падыходзяць для іншых. Нядаўна адзін малады чалавек распавёў мне сваю чайную гісторыю. І ў ёй, нягледзячы на яе ўнікальнасць, як і ў многіх іншых, я пачула: «Я паспрабаваў добры чай, і са мной нешта адбылося, нешта ўнутры змянілася». Мне здаецца, што для кожнага чалавека ёсць «свой чай». І калі ён яго ўрэшце знаходзіць, то пачынае крыху шырэй глядзець на свет, больш пра сябе разумее…

— Алёна, а вы знайшлі «свой чай»?

— Люблю чай, які здольны здзіўляць. Нядаўна вярнулася з Кітая. Была ў тым ліку ў правінцыі Юньнань. Гэта тое месца, дзе вырабляюць адзін з самых карысных гатункаў кітайскага чаю — сапраўдны пуэр. Да паездкі ў Кітай я, як і большасць знаёмых, аддавала перавагу шу пуэру (альбо «чорнаму» пуэру, як яго яшчэ называюць). Але з'язджалі мы з сябрамі адтуль заўзятымі аматарамі шэн пуэра (зялёнага пуэра). Наш гід — кітаец Сайман — спачатку толькі ўсміхаўся, заўважыўшы, што мы любім шу пуэра, і паўтараў: «Пачаткоўцы, нічога вы не разумееце». І ў выніку звярнуў нас у шэн пуэрызм. Аказалася, што для сапраўдных знатакоў чаю важны не столькі смак і водар, колькі «цы» — энергія, якая ёсць у чаі. А яе, як лічаць кітайцы, больш за ўсё ў вытрыманым гадамі шэн пуэры. Толькі вытрымліваюць яго не ў зямлі, як ходзяць чуткі.

«Не варта затрымлівацца на стадыі пакецікаў»

— Сучаснае жыццё занадта мітуслівае. Алёна, як часта вам удаецца папіць чаю са сваімі блізкімі?

— Кожная раніца ў маёй сям'і пачынаецца з шу пуэра, бо яго любяць мой муж і дзіця. Мы жывём за горадам, таму каб зранку папіць разам чаю і пры гэтым паспець адвезці дачку ў школу, трэба ўстаць на паўгадзіны раней. Але, паверце, гэта таго варта! Першым падымаецца муж і ставіць ваду. Калі вада нагрэлася, падхопліваюся я і заварваю чай. За чаем мы няспешна дзелімся планамі на дзень. А затым вельмі энергічна пачынаем збірацца. Важна, каб члены сям'і праводзілі, па магчымасці, як мага больш часу разам. А ўжо за чаем альбо за настольнымі гульнямі — гэта не прынцыпова. Мы з мужам жаваранкі, таму нам камфортна піць чай зранку. Калі адзін з партнёраў сава, то я б не раіла ператвараць сумеснае чаяванне ў ранішнюю катаргу. Можна зрабіць гэта і ўвечары.

— Перад сном жа, наколькі я ведаю, не рэкамендуецца піць ні каву, ні чай?

— Перад сном не раяць піць моцны чай, бо ён бадзёрыць. А калі заварыць слабы, ці дадаць у моцны чай малака, каб кафеін крыху нейтралізаваць, то чаму не? Слабы чай, наадварот, расслабляе.

— Алёна, а як вы ставіцеся да чаю ў пакеціках, да араматызаванага чаю?

— Я за натуральнасць ва ўсім. Лічу, што заўсёды лепш у чай дадаць мацярдушку, свежыя лісткі мяты ці ягады. Гэта нашмат карысней. Я зараз не п'ю, напрыклад, малочны ўлун, бо, у асноўным, у яго дадаюць араматызатары. Ніякім малаком там і не пахне. Вы ж, пэўна, чулі міф пра тое, што ўлун вымочваюць у малацэ? Задумайцеся: як можа нацыя, якая наогул не п'е малака, вымочваць чай у малацэ? Яшчэ большую ўсмешку выклікаюць аповеды пра тое, што малаком паліваюць карані чайнага дрэва, пасля чаго лісты атрымліваюцца малочнымі. Што тычыцца чаю ў пакеціках, то ўсе людзі праходзяць гэтую стадыю. І я — не выключэнне. Пытанне не ў тым, была ў цябе гэта стадыя ці не, а ў тым — затрымаўся ты ў ёй ці не. Ды і ў пакеціках таксама можна часам знайсці добры чай. Свет вельмі цікавы, і добра, што тут ёсць шмат чаго для розных выпадкаў.

— Ці праўда, што чай здольны пазбавіць ад алкагольнай залежнасці?

— Чай — вельмі добрая замена алкаголю. Калі людзі прыходзяць да мяне на заняткі, я пытаюся: «Чаму вы прыйшлі?» Часам мужчыны кажуць: «Я хачу кінуць піць піва». Часта людзі п'юць, бо адчуваюць унутры пустэчу, ім хочацца расслабіцца. А ў чаі ёсць нешта — цеплыня, ці тая ж сама энергія «цы», якая дапамагае чалавеку запоўніць гэту душэўную пустэчу. А нядаўна прыйшоў хлопец, каб кінуць піць чай з цукрам. Тут у нас ён адкрыў для сябе белы чай. Яму настолькі ён спадабаўся, што п'е яго выключна без цукру. Кажа: «Белы чай настолькі смачны, што я не хачу перабіваць яго смак».

«Была ў шоку, калі афіцыянт прынёс дарагі чай з водарам хлоркі»

— Алёна, дзе вы набываеце чай?

— Апошнім часам стараюся замаўляць з Кітая, праз знаёмых або інтэрнэт-крамы. Асобныя гатункі набываю ў Мінску, у спецыялізаваных крамах. Бо там, у адрозненне ад супермаркетаў, дзе прадаюцца пераважна купажы, у якім змяшана шмат гатункаў, можна знайсці неблагія монагатункі. Галоўнае сачыць, каб тавар быў якасным. Аднойчы на чайную цырымонію дзяўчынка прынесла жоўты чай. Сказала, што набыла яго ў інтэрнэт-краме. Я вымушана была яе расчараваць: замест жоўтага ёй падсунулі белы чай. Як бачыце, чалавеку, які не разбіраецца, лёгка прадаць што заўгодна. Таму карэктнасць і шчырасць прадаўцоў вельмі важная.

— А як навучыцца разбірацца ў розных гатунках чаю?

— Чамусьці, калі мы набываем машыну, то абавязкова цікавімся яе характарыстыкамі. Тое ж самае раю зрабіць і перад тым, як замовіць дарагі чай. Праўда, у нас пакуль вельмі мала сапраўды якаснага чаю, а тым больш дакладнай інфармацыі пра яго. Калі мы ў Кітаі набывалі чай у фермера, ён з такой любоўю расказваў нам пра яго, падарыў карту мясцовасці, паказаў фота, як ён разам са сваёй сям'ёй збірае лісцікі з чайнага куста. Гэта так міла. Спадзяюся, што з часам у нас нешта зменіцца. З'явіцца больш інтэрнэт-крам, больш людзей, якія зацікаўлены ў якасным чаі. Пакуль жа ў нас людзі, у адрозненне ад кітайцаў, не гатовы плаціць за вельмі якасны пуэр 2 тысячы долараў. Кітайцы самі кажуць, што ў іх цэны на якасны чай на ўнутраным рынку вышэйшыя, чым на знешнім. Бо ў іх пакупніцкая здольнасць і ўменне разбірацца ў чаі значна вышэйшая, чым у еўрапейцаў. У нас жа, і гэта вельмі сумна, чай ператварыўся ў напой для запівання бутэрбродаў. Людзі, якія паважаюць гэты напой, наўрад ці будуць змешваць гэтыя працэсы: яны спачатку паядуць, а затым будуць атрымліваць асалоду ад чаявання.

— Якасць вады, якая выкарыстоўваецца для прыгатавання чаю, таксама мае істотнае значэнне?

— Часта людзі, якія набываюць дарагі чай, здзіўляюцца: «Аддалі такія грошы, а чай нясмачны!..». Насамрэч, можа, гэта не чай благі, а яны няправільна яго заварылі і тым самым проста не далі яму праявіць сябе. Вось дзве асноўныя памылкі. Не трэба заліваць чай кіпенем, асабліва зялёны (тэмпература вады залежыць ад гатунку чаю; як правіла, яна не павінна перавышаць 95 градусаў), бо кіпенем можна проста «забіць» смак. Акрамя таго, сачыце, каб вада была мяккай, у ідэале — крынічнай. Але ні ў якім разе не хлараванай з-пад крана. Запомніце, хлорка «забівае» нават самы якасны чай. Гэта праблема, на жаль, вельмі многіх кавярняў і рэстаранаў, якія не сочаць за якасцю вады. Я была ў шоку, калі ў адным з мінскіх рэстаранаў мне падалі дарагі чай, завараны хлараванай вадой. Чамусьці ў нас лічыцца, што не трэба абучаць персанал заварваць чай, што з гэтым можа справіцца любы дурань. У выніку атрымліваецца, што кліенты не атрымліваюць той асалоды ад гэтага напою, якую б маглі атрымаць.

— Скажыце, чаму звычайна першы настой чаю зліваецца?

— Лічыцца што пешая вада — вада для ног. Яна праліваецца, каб змыць чайны пыл з заваркі. Часткова сыходзіць кафеін, чай прабуджаецца.

— А колькі разоў можна заварваць чай?

— А за яки прамежак часу можа даведацца пра чалавека?..

— Усё залежыць ад чалавека…

— Тут тое ж самае. Усё залежыць ад гатунку чаю, колькасці заваркі і вады, ад посуду, у якім заварваецца чай, а таксама ад таго, колькі часу вы настойваеце чай, які ваш настрой, які настой вам падабаецца. Таму калі кажуць, што ўлун толькі 10 разоў можна заварваць, зялёны чай — 2, а белы — 5 — гэта для мяне дзіўна. Чай у Кітаі заварваюць, пакуль яго смачна піць. Калі казаць пра самы «доўгаіграючы» чай, то гэта ўлуны і шэн пуэры. Некаторыя з іх могуць заварвацца да 20 разоў.

— Алёна, якое месца чай займае ў вашым жыцці?

— Ён займае месца ў кубку і ў сэрцы *(загадкава ўсміхаецца)*. …У аднаго чалавека спыталі, як змянілася яго жыццё пасля таго, як ён стаў прасветленым? «Я, як звычайна ўстаю, п'ю чай, распальваю агач, гатую ежу, падмятаю двор, даглядаю свайго майстра…» Тады яго спыталі, а што ён рабіў раней? — «Раней я рабіў усё тое ж. Але без задавальнення, па звычцы. І толькі калі захварэў майстар, я зразумеў, што без мяне ён не зможа развесці агонь і прыгатаваць ежу. І ў маім сэрцы прачнулася любоў да чалавека, якога я даглядаў, і маё стаўленне да ўсяго змянілася». Самае важнае ў жыцці — не што ты робіш (праводзіш чайную цырымонію ці пішаш артыкул), важна, з чым у сэрцы ты гэта робіш…

Надзея ДРЫЛА.
Фота Надзеі БУЖАН.

Хочаце — верце, хочаце — не

Адкрыццё чаю прыпісваюць адной з цэнтральных фігур кітайскай міфалогіі — Шэнь Нуну. Апошні меў галаву быка і цела чалавека, жывот у яго быў з празрыстага нефрыту. Згодна з легендай, Шэнь Нун блукаў па Кітаі і вывучаў расліны, каб аддзяліць атрутныя ад лекавых. За ўздзеяннем травы, якую з'еў, назіраў праз свой празрысты жывот. Аднойчы ён пакаштаваў чарговую расліну і адчуў слабасць у целе. Лёг пад бліжэйшы куст і заплюшчыў вочы. Раптам з лісця гэтага куста (ім аказаўся чайны куст) на яго вусны скацілася расінка. Шэнь Нун яе праглынуў і адчуў прыліў бадзёрасці. З тых часоў ён заўсёды насіў з сабой тыя цудадзейныя лісты. І, кажуць, навучыў старажытных кітайцаў ужываць іх адвар у якасці лекаў.

Дабрачыннасць носіць чырвонае

Яны не прэтэндуюць на тое, каб выратаваць увесь свет. Але дапамагчы і нават выратаваць аднаго канкрэтнага чалавека могуць дакладна. З такой мэтай у сталіцы ў чацвёрты раз адбылася дабрачынная акцыя «Red Dress МТС». Прыгожыя, творчыя, вядомыя і ўплывовыя беларускі, а таксама жонкі замежных паслоў і дыпламатаў узялі ўдзел у дэфіле чырвоных сукенак, каб сабраць грошы на тэрміновую аперацыю маленькаму мінчаніну Багдану Саўчыку.

2-гадовы Багдан, як і большасць малых гэтага ўзросту, жвавы і гарэзлівы. Але бегаць, скакаць, гойдацца на арэлях са старэйшым братам, нават моцна хвалявацца яму нельга: забаранілі ўрачы, бо маленькае сэрцайка можа не справіцца з нагрузкамі. Каб вярнуць сардэчны рытм хлопчыка да нармальнага, адной падтрымліваючай тэрапіі недастаткова — патрэбна аперацыя. У нашай краіне падобныя робяць толькі дзецям з 5–6 гадоў. Дапамагчы згадзіліся ўрачы адной з вільнюскіх клінік, але на аперацыю неабходна сабраць немалыя грошы…

«Усё гэта — не дзеля гламуру, не для таго, каб сябе паказаць і на іншых паглядзець. Гэта збор сродкаў на вельмі важную справу»,— зазначыў вядучы вечара, бацька дваіх дзяцей Дзяніс Кур'ян, жонка якога, між іншым, таксама ўдзельнічала ў паказе. Спявачкі і тэлевядучыя, спартсменкі і мадэлі, бізнес-лэдзі — амаль тры дзясяткі яркіх жанчын выйшлі на подыум Нацыянальнай школы прыгажосці ў сукенках беларускіх дызайнераў, пашытых спецыяльна да паказу, каб сабраць неабходныя для лячэння сродкі і ў чарговы раз прыцягнуць увагу грамадскасці да адной з самых распаўсюджаных хвароб XXI стагоддзя — сардэчна-сасудзістых паталогій. Усё ж менавіта кардыялагічныя захворванні знаходзяцца на першым месцы ў прычынах смяротнасці дарослага насельніцтва ў многіх краінах свету, у тым ліку і ў Беларусі. І ўсё часцей у дзяцей таксама выяўляюцца праблемы сардэчна-сасудзістай сістэмы, павялічваецца колькасць малых з груп рызыкі развіцця хранічных формаў паталогіі і заўчаснай смерці ў маладым узросце…

Тэлевядучая Марына Грыцук зазначыла, што для яе ўдзел у акцыі — не толькі сацыяльная місія, але і асабістае пытанне: яна на ўласным мацярынскім вопыце зведала, што такое праблемы з сэрцам у маленькіх дзяцей. Заслужаная артыстка Беларусі Іна Афанасьева (яна ўдзельнічае ў «дэфіле чырвоных сукенак», пачынаючы з самай першай акцыі), кіраўнік партала diva.by Алена Каравец, тэлевядучая і мадэль Вольга Багатырэвіч, спявачка і актрыса Аляксандра Гайдук, дызайнер Лінда Намус **(на фота)**, удзельніца Міжнароднага дабрачыннага клуба жонак паслоў, дыпламатаў і замежных прадстаўнікоў у Беларусі Мірват абу Шакер, спявачка Паліна Смолава, вядучая балерына Вялікага тэатра оперы і балета Людміла Хітрова, кіраўнік прэс-службы сталічнай ДАІ Таццяна Харлінская, тэлевядучая Кацярына Забянько — многія з удзельніц акцыі прыйшлі на паказ з уласнымі дзецьмі і не толькі дэфіліравалі па подыуме, але і самі ахвяравалі грошы, каб дапамагчы аднаму маленькаму сэрцу біцца роўна.

Паспрыяць вырашэнню гэтай задачы мог таксама кожны ахвотны, набыўшы квіток на мерапрыемства (коштам 350 тысяч рублёў) альбо ахвяраваўшы грошы непасрэдна падчас паказу — кожны дабрачыннік атрымліваў за ўнёсак кавалачак пазла, з якога складалі вялізнае сімвалічнае чырвонае сэрца.

Ад пачатку

Міжнародны грамадскі рух па барацьбе з захворваннямі сэрца і сасудаў The Heart Truth — «Праўда сэрца» — быў заснаваны ў 2002 годзе ў Нью-Ёрку па ініцыятыве амерыканскіх кардыёлагаў. Цэнтральнай яго падзеяй стала акцыя Red Dress Collection — дэфіле зорак эстрады, вядомых спартсменак, грамадскіх актывістак і медыйных персон у чырвоных сукенках, якія сімвалізуюць жыццё, энергію крыві і здаровага сэрца.

Штогод у рэчышчы руху The Heart Truth падобныя дабрачынныя паказы адбываюцца ў розных краінах свету. Сродкі ад іх арганізатары накіроўваюць на дапамогу людзям, якія пакутуюць на сардэчна-сасудзістыя захворванні. У Беларусі ўжо чацвёрты

Фота Паўла ПАТАШНІКАВА.

год запар акцыю праводзіць «Жаночы часопіс» пры падтрымцы мабільнага аператара МТС.

Дарэчы, арганізатары абавязкова адсочваюць і налета робяць справаздачы, ці паспяхова прайшлі аперацыі і лячэнне ў іх «падапечных». Прыкладам, у 2010 годзе больш як 87 мільёнаў рублёў былі перададзены на лячэнне 9-гадовага Івана Дзярнушкіна з Гомельскай вобласці, хворага на прыроджаны парок сэрца. У выніку хлопчыку зрабілі аперацыю ў Вільнюскім кардыяхірургічным цэнтры. У 2011-м на аператыўнае лячэнне 5-гадовага мінчаніна Спартака Дзямянава ўдалося сабраць звыш 139 мільёнаў рублёў. Хлопчык перанёс два хірургічныя ўмяшанні, якія дапамаглі аднавіць нармальны рытм сэрца. Летась дзякуючы акцыі ў рэкордна сціслы тэрмін удалося сабраць амаль 9,5 тысячы долараў для аператыўнага лячэння 6-гадовага Максіма Дзікарэвіча з г.п. Смілавічы.

Простая мова

— Штогадовая дабрачынная акцыя «Red Dress МТС» дасягае адразу дзвюх мэт,— мяркуе прэс-сакратар кампаніі МТС Таццяна Курбат.— Па-першае, збірае суму, неабходную для лячэння дзіцяці. Напрыклад, сёлета мы дапамаглі Багдану Саўчыку, у якога сур'ёзная паталогія сэрца, сабраўшы больш як 6500 еўра на аперацыю. А па-другое, такім чынам — праз прыгожае і заўважнае мерапрыемства — мы імкнёмся прыцягнуць увагу людзей да праблемы, якая вельмі востра стаіць для нашай краіны,— росту сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Даты. Падзеі. Людзі

1830 год — у Беларусі, Польшчы і Літве пачалося паўстанне за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. Ужо праз дзень паўстанцы захапілі Варшаву. Царскія войскі вымушаны былі адступіць з Варшавы, а пазней — і з усёй тэрыторыі Польшчы. Значная частка іх сканцэнтравалася ў Беларусі. Тым часам у Варшаве быў сфарміраваны Часовы ўрад, у склад якога ўвайшоў і прадстаўнік дэмакратычных сіл І. Лялевель. У Беларусь, Літву і ва Украіну з Польшчы былі накіраваны эмісары, каб узняць паўстанне і там. У студзені-лютым 1831 года ў Беларусі і Літве быў створаны падпольны Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. У сакавіку-красавіку 1831-га паўстанне

ахапіла Ашмянскі, Браслаўскі, Віленскі, Дзісненскі паветы. У кожным з іх ствараліся ўрады, якія праводзілі рэкруцкі набор у войска. Да канца мая 1831 года ў Віленскай і Мінскай губернях паўстанне было задушана, але працягвалася ў Гродзенскай губерні, што перашкаджала расійскім войскам наступаць на Польшчу. У чэрвені-ліпені 1831-га асабліва актыўнымі былі выступленні паўстанцаў у Пінскім, Мазырскім, Рэчыцкім, Навагрудскім паветах, а таксама на тэрыторыі Магілёўскай і Віцебскай губерняў.

У жніўні 1831 года паўстанне ў Беларусі і Літве пацярпела паражэнне, хоць асобныя атрады дзейнічалі і ў верасні.

1948 год — 65 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Мікалаевіч Шымаў, беларускі вучоны-эканаміст, дзяржаўны дзеяч Беларусі, доктар эканамічных навук (1988), прафесар (1999), заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2011). З 2002 года — рэктар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Аўтар навуковых прац па праблемах тэорыі і метадалогіі эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці, метадалогіі і практыкі прагназавання развіцця складаных сацыяльна-эканамічных сістэм, эканамічнай (вартаснай) ацэнкі прыродных рэсурсаў і прыродна-рэсурснага патэнцыялу тэрыторыі.

1971 год — савецкая касмічная станцыя «Марс-2» дасягнула Марса, даставіўшы на гэтую планету капсулу з вымпелам, на якім была выява герба Савецкага Саюза. Спускальнаму апарату не ўдалося здзейсніць мяккую пасадку, ён упаў і разбіўся, але ўсё-такі стаў першым прадметам з Зямлі, які апынуўся на паверхні Марса.

Было сказана

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік, паэт, драматург, кінасцэнарыст:

«Адбітая у зрэнках,
бы ў палонцы,
Зямля мая ўстае перада мной,
Высокая і чыстая, як сонца.
Чысцейшая, бо плям няма на ёй».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.02	16.54	7.52
Віцебск	8.58	16.36	7.38
Магілёў	8.52	16.43	7.51
Гомель	8.41	16.48	8.07
Гродна	9.16	17.10	7.54
Брэст	9.09	17.18	8.09

Месяц

Маладзік 3 снежня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Васіля, Віктара, Івана, Мацвея, Мікалая, Міхаіла, Сцяпана, Фёдара.*
К. *Дар'і, Маргарыты, Блажэя, Сатурніка, Сцяпана, Фрэдэрыка.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



…у суседзяў

ВАРШАВА	+2..+4°С	КІЕЎ	+1..+3°С	РЫГА	-3..-1°С
ВІЛЬНЮС	-1..+1°С	МАСКВА	-6..-4°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-3..-1°С

УСМІХНЕМСЯ

Працірала лабавое шкло ў машыне і выпадкова... яго выціснула! Што рабіць?

Як ехаць?! Парайце такі лак для валасоў, каб прычоска трымалася!

Дзве сяброўкі.

— Вывела тлустую пляму з канапы.

— Якім сродкам?

— Развялася...

Аб'ява: «Маладая сям'я без дзяцей тэрмінова здыме 1-пакаёвую кватэру. Парадак, чысціню і своечасовую аплату гарантуем».

Унізе прыпіска:

«Людзі, ратуйце ад цешчы!»

Як хутка час ляціць... Не паспеў прачнуцца — ужо трэба ісці з працы дадому.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.434. Індэкс 63850. Зак. № 5057.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 28 лістапада 2013 года.